ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

НЯДЗЕЛЯ, 28 ЖНІЎНЯ 1938 г. № 47 (389)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

СОВЕЦКІ ЗАКОН— ВОЛЯ НАРОДА

Другая Сесія Вярхоўнага Совета СССР вырашыла рад пытанняў велізарнага дзяржаўнага значэння. Сесія аднадушна прыняла адзіны дзяржаўны бюджэт СССР, які сведчыць аб росквіце радзімы, аб росце народнага добрабыту і магутнасці нашай вялікай дзяржавы.

Выбраннікі народа аднадушна ўхвалілі асігнаванні 27 мільярдаў рублёў на абарону соцыялістычнай радзімы, на далейшае ўмацаванне нашай любімай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, якія пільна стаяць на варце мірнай працы вялікага совецкага народа.

Другая Сесія зацвердзіла з поўнай аднадушнасцю закон аб судаўстройстве, прасякнуты духам вялікай Сталінскай Канстытуцыі. Гэты закон узнімае на небывалую вышыню аўтарытэт суда і яго выхаваўчую ролю. Перад совецкім судом, увасабляючым у сабе прынцыпы соцыялістычнай дэмакратыі, адкрываюцца велізарныя прасторы для карыснай, плённай работы на карысць народа і соцыялістычнай дзяржавы. Вялікі завет Леніна аб пагалоўным удзеле грамадзян у судовай рабоце, роўна як і ва ўсім кіраванні дзяржавай, знайшоў сваё яркае адлюстраванне ў прынятым Вярхоўным Советам законе аб судаўстройстве.

З выключным уздымам дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР абмеркавалі і зацвердзілі закон «Аб грамадзянстве СССР». Працоўныя нашай вялікай радзімы з вялікім гонарам носяць ганаровае званне грамадзян СССР. У Сталінскай Канстытуцыі запісаны велізарнейшыя правы грамадзян СССР. Гэтыя правы разам з тым ускладаюць велізарнейшую адказнасць і абавязкі на совецкіх грамадзян перад соцыялістычнай радзімай, перад працоўнымі ўсяго свету за будоўлю соцыялістычнага грамадства.

Прыняты закон аб грамадзянстве СССР высока ўзнімае совецкага грамадзяніна ў вачах працоўных капіталістычных краін. Працоўныя ўсяго свету ўбачаць у гэтым законе вялікія сталінскія клопаты аб абароне правоў грамадзяніна соцыялістычнай краіны, прадстаўляючых сабой неацанімыя заваёвы.

Другая Сесія аднагалосна зацвердзіла «Закон аб парадку ратыфікацыі і дэнансацыі міжнародных дагавораў СССР». Сесія абмеркавала і аднагалосна зацвердзіла «Закон аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак». Вялікую ўвагу Сесія звярнула на пытанні, звязаныя з падрыхтоўкаю да Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, якая з'явіцца паказам росту соцыялістычнай гаспадаркі.

Работа Другой Сесіі Вярхоўнага Совета СССР з'яўляецца прыкладам для нас па дзелавітасці і арганізаванасці ў вырашэнні важнейшых дзяржаўных пытанняў. Аднадушнасць дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР, праяўленая ў часе абмеркавання і прыняцця законаў, з'яўляецца яркім выяўленнем аднадушнасці совецкага народа, аб'яднанага вакол партыі Леніна—Сталіна і Совецкага Урада, натхнёнага высокімі ідэаламі комунізма, аддаючага ўсе свае сілы барацьбе за далейшыя перамогі соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

Толькі дваццаць год прайшло з таго часу, калі пачаў будаваць совецкі народ радаснае і шчаслівае жыццё на адной шостай часткі зямнога шара. Гераічная праца совецкага народа, згуртаванага пад сцягам Леніна—Сталіна, дала выдатнейшыя рэзультаты—створан сонечны будынак соцыялізма; яркае святло яго рубінавых зорак відаць ва ўсім свеце.

З велізарнейшым энтузіязмам дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР віталі таварыша Сталіна—бацьку і друга совецкага народа. Заключнае пасяджэнне Сесіі было завершана бурнай авацыяй у гонар тварца вялікай Канстытуцыі перамогшага соцыялізма, авацыяй, выказваючай гарачую любоў да таварыша Сталіна ўсіх працоўных совецкай краіны.

«Хартыя чалавечага шчасця»—так завуць народы СССР сваю Канстытуцыю, якая стала грозным абвінаваўчым актам супроць сіл фашысцкай рэакцыі, тых сіл, якія залілі крывёю землі адважнага абісінскага народа, гераічных народаў Іспаніі, Кітая, ператварылі ў фашысцкі засценак Германію і Італію, знішчылі велізарныя культурныя каштоўнасці. І калі дзесяць гадоў таму назад таварыш Сталін гаварыў, што «просты факт існавання «бальшэвіцкай дзяржавы» накладвае узду на чорныя сілы рэакцыі, аблягчае прыгнечаным класам барацьбу за сваё вызваленне», то гэтыя словы з яшчэ большай сілаю гучаць у нашы дні, калі краіна соцыялізма і яе Чырвоная Армія з'яўляюцца магутным аплотам справы міру, лепшай надзеяй усяго перадавога і прагрэсіўнага чалавецтва, якое змагаецца супроць пагрозы новай сусветнай вайны.

Законы, прынятыя Сесіяй, увасабляюць у сабе волю шматнацыянальнага совецкага народа, служаць мэтаю ўмацавання соцыялістычнага ладу. Совецкі закон прымаецца ў імя інтарэсаў і карысці народа. Аўтарытэт совецкага закона бясспрэчны. Іменна таму грамадзяне СССР з радасцю нясуць свае абавязкі, запісаныя ў артыкуле 130 Сталінскай Канстытуцыі,—«выконваць законы».

У нашай совецкай краіне, дзе ва ўладзе стаяць самі працоўныя, закон ёсць выказаная народам воля. Захоўваць совецкі закон—гэта значыць выконваць волю народа. Таму совецкі грамадзянін не толькі падпарадкуецца закону, але і паважае яго. Ен угледжвае свае абавязкі, свой высокі грамадзянскі абавязак у тым, каб свята захоўваць і выконваць Асноўны Закон краіны—Сталінскую Канстытуцыю, аберагаць заваёвы соцыялізма ад замахаў на іх ворагаў народа.

Законы, прынятыя Другой Сесіяй Вярхоўнага Совета СССР, увайшлі ў сілу і падлягаюць няўхільнаму выкананню. Для пісьменнікаў і работнікаў мастацтваў яны з'яўляюцца новай тэматычнай крыніцай, бо ў іх адлюстравана магутнасць нашай радзімы і дэмакратычных заваёў нашага вялікага народа, запісаных у Сталінскай Канстытуцыі.

У работнікаў мастацкага слова, «інжынераў душ», законы, прынятыя Сесіяй, выклікаюць імкненне ўзняць вышэй нашу совецкую літаратуру, самую перадавую і прагрэсіўную на свеце. Вялікая і ганаровая задача стаіць перад пісьменнікамі—выхоўваць у духу патрыятызма совецкіх чытачоў.

Совецкі пісьменнік у сваёй творчасці павінен адлюстроўваць перавагі соцыялістычнага грамадства ў параўнанні з капіталізмам, перавагу нашай дэмакратыі ў параўнанні з буржуазнай, высокую годнасць совецкіх людзей, людзей совецкай этыкі і маралі—усё гэта значыць выхоўваць у чытачоў гордасць за СССР, за радзіму, гэта значыць выхоўваць пачуццё патрыятызма.

Совецкія пісьменнікі і работнікі мастацтваў сваімі мастацкімі творамі павінны паказаць веліч краіны соцыялізма і законаў, прынятых Сесіяй у інтарэсах працоўных мас. Свой талент і дар мастака яны павінны паставіць на службу рабочаму класу, аддаць барацьбе за справу комунізма. Партыяй, вялікім Сталіным і Совецкім Урадам створаны ўсе ўмовы для плённай работы работнікаў літаратуры і мастацтва. Совецкі лад з'яўляецца адзінай спрыяючай асновай, узнімаючай таленты з народа для развіцця яго літаратуры і мастацтва.

Совецкія пісьменнікі і работнікі мастацтваў у поўнацэнных мастацкіх вобразах павінны паказаць росквіт соцыялістычнай радзімы, працоўнага чалавека, тварца новай гісторыі чалавечага грамадства, веліч геніяў Леніна—Сталіна, паказаўшых шлях вызвалення працоўных ад капіталістычнага прыгнёту.

Зразумеўшы і вырашыўшы гэтыя задачы, совецкія пісьменнікі і работнікі мастацтваў выканаюць свой абавязак перад пралетарскай рэвалюцыяй.

Д У Б

На ўзбярэжжы блакітнай ракі,
Дзе гамоніць аір з асакой,
Дзе шумяць у лазе вецяркі,
Будзь то ўвечар ці ранняй парой, —

Нібы волат, дуб казачна стаў,
Горда ўзняўшы свой велічны стан.

На ўзбярэжжы блакітнай ракі
Ен у бурах няшчадных узрос.
Бачыў шмат за свае ён вякі
Вераснёўскіх і чэрвеньскіх рос.

Ні мароз, ні жара, ні туман
Сіл тваіх не змаглі, велікан.

І не раз надыходзіў з-за гор,
Выварочваў з карэннем сасну
Не адзін страшны вецер-віхор,
Але дуб ля ракі не скрануў.

Ад віхроў падаў лес, як трава,
Дуб усе навальніцы стрываў.

Ен стаіць на ўзбярэжжы ракі,
Усіх пушчаў магутнейшы сын.
Над ім гоман вядуць вецяркі,
Сілу дуба ўслаўляюць лясы.

Гэты дуб не пахіліць свой стан
А ні ўлетні, ні ўзімні буран.

Так стаіць, між успененых вод,
Як нязломная сіла, уцёс.
Гэта сіла, — совецкі народ, —
Майго краю, што ў бурах узрос.

І няма такіх бур-навальніц,
Што змаглі-б гэты ўцёс пахіліць.

Анатоль АСТРЭЙКА.

ДРУГАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР 1-га СКЛІКАННЯ

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ
АБ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА 21 жніўня 1938 г.

21 жніўня, у 11 гадзін дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося восьмае пасяджэнне Совета Саюза.

Старшынствуе Старшыня Совета Саюза дэпутат **Андрэеў** А. А.

У парадку дня — спрэчкі па дакладу аб праекце закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак».

У спрэчках выступілі дэпутаты **Мельнікаў** Р. Е. (Смаленская сельская акруга, Смаленская вобласць), **Сабераў** М. С. (Сергацкая акруга, Горкаўская вобласць), **Тронін** А. В. (Можгінская акруга, Удмурцкая АССР), **Ежоў** А. С. (Будзёнаўская акруга, Орджанікідзеўскі край), **Лёліна** Н. С. (Асіпавіцкая акруга, Беларуская ССР), **Скілкоў** Ф. М. (Мілераўская акруга, Растоўская вобласць), **Палякоў** Ф. І. (Разанская сельская акруга, Разанская вобласць), **Немчэнка** П. І. (Расошанская акруга, Варонежская вобласць), **Салава** Е. С. (Курская сельская акруга, Курская вобласць) і **Фомін** Р. А. (Бранская акруга, Орлоўская вобласць).

Па сканчэнні спрэчак Совет Саюза заслухоўвае заключнае слова дакладчыка — дэпутата **Угарава** А. І.

Затым Совет Саюза пераходзіць да галасавання і зацвярджэння «Закона аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак». Совет Саюза аднагалосна зацвярджае «Закон аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак».

Па прапанове дэпутата **Гудава** І. І. Совет Саюза прымае пастанову — заслухаць і абмеркаваць сёмае пытанне парадку дня Сесіі — Аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, а таксама восьмае пытанне парадку дня — Аб Указах Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, прынятых у перыяд паміж Першай і Другой Сесіямі і належачых зацвярджэнню Вярхоўнага Совета СССР, —на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ
АБ СУМЕСНЫМ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА І СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

21 жніўня 1938 года

21 жніўня, у 6 гадзін вечара, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося пятае, заключнае сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

Вярхоўны Совет СССР прыступае да разгляду сёмага пытання парадку дня Сесіі — Аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, унесенага ў Вярхоўны Совет СССР ад групы дэпутатаў Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

З дакладам па гэтаму пытанню выступіў дэпутат **Хрушчоў** Н. С.

Пасля даклада тав. Хрушчова Вярхоўны Совет СССР пераходзіць да спрэчак.

У спрэчках выступілі дэпутаты **Берыя** Л. П. (Тбіліская—Сталінская акруга, Грузінская ССР), **Маркін** Д. Ф. (Мазырская гарадская акруга, Беларуская ССР), **Каратноў** С. К. (Ібрэсінская акруга, Чувашская АССР), **Юркін** Т. А. (Орджанікідзеўская акруга, РСФСР), **Конуспаеў** Ш. (Алма-Ацінская сельская акруга, Казахская ССР), Намеснік Народнага Камісара Земляробства СССР тав. **Венедзінтаў** І. А. і дэпутат **Ціцін** Н. В. (Тарская акруга, Омская вобласць).

Пасля прамовы дэпутата Ціціна спрэчкі спыняюцца і Вярхоўны Совет СССР заслухоўвае заключнае слова дакладчыка—дэпутата **Хрушчова** Н. С.

Вярхоўны Совет СССР прыступае да галасавання праекта закона «Аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы». Раздзельным галасаваннем па палатах Вярхоўны Совет СССР аднагалосна зацвярджае «Закон аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы».

Затым Вярхоўны Совет СССР пераходзіць да разгляду восьмага пытання парадку дня Сесіі — Аб Указах Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, прынятых у перыяд паміж Першай і Другой Сесіямі і падлягаючых зацвярджэнню Вярхоўнага Совета СССР.

З дакладам па гэтаму пытанню выступіў Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР дэпутат **Горкін** А. Ф.

Тав. Горкін паведамляе, што ў перыяд паміж Першай і Другой Сесіямі Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР выдаў наступныя Указы, належачыя зацвярджэнню Вярхоўнага Совета СССР:

аб амністыі ў азнаменаванне 20-годдзя Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі;

аб аслабаненні ад пасад Народных Камісараў СССР — А. В. Бакуліна, Н. І. Пахомава, М. В. Папова, А. Д. Брускіна, А. Л. Гілінскага;

аб назначэнні тав. Л. М. Кагановіча Народным Камісарам Шляхоў Зносін па сумяшчэнню з работай Народнага Камісара Цяжкай Прамысловасці, тав. Н. І. Ежова — Народным Камісарам Воднага Транспарта па сумяшчэнню з работай Народнага Камісара Унутраных Спраў, тав. С. Е. Скрыннікава — Народным Камісарам Загатовак, тав. В. К. Львова — Народным Камісарам Машынабудаўніцтва, тав. І. Г. Кабанава — Народным Камісарам Харчовай Прамысловасці;

аб назначэнні тав. Л. М. Кагановіча Намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў СССР з пакіданнем яго Народным Камісарам Цяжкай Прамысловасці і Народным Камісарам Шляхоў Зносін;

аб утварэнні ў саставе РСФСР Мурманскай вобласці і ў саставе Украінскай ССР — Сталінскай і Варашылаўградскай абласцей.

Па сканчэнні даклада тав. Горкіна Вярхоўны Совет СССР пераходзіць да галасавання і зацвярджэння Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, прынятых у перыяд паміж Першай і Другой Сесіямі і падлягаючых зацвярджэнню Вярхоўнага Совета СССР, і аднагалосна зацвярджае іх.

Раздзельным галасаваннем па палатах Вярхоўны Совет СССР аднагалосна прымае пастанову аб змене і дапаўненні артыкулаў 22 і 23 Канстытуцыі (асноўнага закона) СССР, у сувязі з рашэннямі Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

Старшынствуючы — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М. паведамляе, што парадак дня Другой Сесіі вычарпан, і абвяшчае Другую Сесію Вярхоўнага Совета СССР закрытай.

ДЗЕННІК ПАСЯДЖЭННЯЎ СЕСІІ 21 жніўня 1938 г.

У СОВЕЦЕ САЮЗА

Учора, 21 жніўня, днём, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося восьмае пасяджэнне Совета Саюза.

У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада, Члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, Народныя Камісары.

Старшынствуе — Старшыня Совета Саюза дэпутат **Андрэеў** А. А.

У парадку дня — спрэчкі па дакладу аб праекце закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак».

Першым выступае дэпутат **Мельнікаў** Р. Е. Ен падкрэслівае вялікае значэнне ўнесенага Камісіяй Заканадаўчых Меркаванняў Совета Саюза праекта закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак». Гэты законапраект з'яўляецца выражэннем сталінскай палітыкі партыі і ўрада, накіраванай да ўсямернага ўмацавання калгасаў, іх далейшага росквіту.

— Я, як старшыня калгаса, — гаворыць выступіўшы затым дэпутат **Сабераў** М. С., — палкам і поўнасцю адабраю і падтрымліваю прадстаўлены на зацвярджэнне Сесіі Вярхоўнага Совета праект закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак».

Выступае дэпутат **Тронін** А. В.

— Закон «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак» сустрэне поўнае адабрэнне многамільённых мас калгаснага сялянства.

Перамога калгаснага ладу паказала былым батракам, беднякам, серадняком, а зараз калгаснікам, рэальна адчуваемыя матэрыяльныя выгоды, паказала на практыцы шлях да сапраўднага культурнага жыцця, шлях далучэння да актыўнага палітычнага жыцця.

Слова атрымлівае дэпутат **Ежоў** А. С.

— Калгаснікі, — адзначае ён,—справядліва звяртаюць увагу на неабходнасць спынення спекуляцыі з боку аднаасобных гаспадарак, маючых коней. Трэба прымусіць аднаасобныя гаспадаркі па-сапраўднаму выконваць грамадскія і дзяржаўныя абавязацельствы. Я ўпэўнен, што абмяркоўваемы Сесіяй законапраект будзе прынят дэпутатамі аднадушна і аднадушна падтрыман калгаснікамі ўсёй краіны.

— Калгасны лад стаў непахіснай асновай заможнага, культурнага і шчаслівага жыцця совецкага сялянства, — гаворыць дэпутат **Лёліна** Н. С. — Сталінскі статут сельскагаспадарчай арцелі накіроўвае ўсё жыццё калгасаў па шляху новых і новых перамог. Я сама калгасніца, зараз працую старшынёй раённага выканкома ў Беларускай ССР, бачу і радуюся таму, як з кожным днём нашы калгасы становяцца ўсё багацей, а калгаснікі заможней. Але дзені-дзе асталіся яшчэ гаспадаркі аднаасобнікаў. Маючы коней, яны выкарыстоўваюць іх не столькі ў сваёй гаспадарцы, колькі для нажывы. Па нашаму раёну і іншых раёнах нямала фактаў невыканання аднаасобнікамі дзяржаўных абавязацельстваў па дарожнаму будаўніцтву і т. д. Калгаснікі паўсямесна ўзнімаюць пытанне перад совецкімі арганізацыямі аб неабходнасці выдання такога закона, які спыніў-бы спекуляцыйнае выкарыстоўванне коней аднаасобнымі гаспадаркамі.

Аб новым, радасным жыцці данскога казацтва гаворыць дэпутат **Скілкаў** Ф. М.

Аб фактах спекуляцыйнага скарыстання коней аднаасобнікамі паведамляе ў сваім выступленні дэпутат **Палякоў** Ф. І. У радзе раёнаў Разанскай вобласці, займаючыся ізвозам, яны зарабляюць ад 70 да 100 руб. у дзень. Тав. Палякоў цалкам і поўнасцю падтрымлівае законапраект.

Выступіўшы следам затым дэпутат **Немчэнка** П. І. таксама адабрае ўнесены на абмеркаванне Сесіі законапраект.

— З пачуццём глыбокага задаволення,—заяўляе дэпутат **Салава** Е. С., — прымуць калгаснікі гэты закон, які выражае сталінскія клопаты аб калгасах і калгасніках.

Дэпутат **Фамін** Р. А. у сваім выступленні асуджае ліберальныя адносіны некаторых мясцовых совецкіх і фінансавых органаў, якія мірацца з невыкананнем аднаасобнікамі сваіх абавязацельстваў перад совецкай дзяржавай. Ен паведамляе, што ў радзе раёнаў Орлоўскай вобласці аднаасобнікі, спекуляцыйна скарыстоўваючы маючыхся ў іх коней, зарабляюць па 6—7 тысяч рублёў у год і не плоцяць ніякіх падаткаў. Тав. Фамін палкам і поўнасцю падтрымлівае прапанову раней выступіўшых дэпутатаў — зацвердзіць праект закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак».

Пасля выступлення дэпутата Фаміна спрэчкі спыняюцца.

Совет Саюза заслухоўвае заключнае слова дакладчыка — дэпутата **Угарава** А. І.

Затым Совет Саюза пераходзіць да галасавання і зацвярджэння «Закона аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак». Совет Саюза аднагалосна зацвярджае «Закон аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак».

Па прапанове дэпутата **Гудава** І. І. Совет Саюза прымае пастанову—заслухаць і абмеркаваць сёмае пытанне парадку дня Сесіі — Аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, а таксама восьмае пытанне парадку дня — Аб Указах Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, прынятых у перыяд паміж Першай і Другой Сесіямі і належачых зацвярджэнню Вярхоўнага Совета СССР,—на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

(БЕЛТА).

НА СУМЕСНЫМ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА І СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

Вечарам, 21 жніўня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося пятае, заключнае сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада, Члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, Народныя Камісары.

Старшынствуе — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

У парадку дня — пытанне Аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, унесенае групай дэпутатаў Украінскай ССР.

З дакладам па гэтаму пытанню выступае дэпутат **Хрушчоў** Н. С.

Па дакладу дэпутата Хрушчова пачынаюцца спрэчкі.

Старшынствуючы — дэпутат **Швернік** Н. М. прадастаўляе слова дэпутату **Берыя** Л. П.

— Абмяркоўваемае на Сесіі пытанне Аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, — гаворыць тав. Берыя, — мае вялікае палітычнае значэнне. Выстаўка павінна прадэманстраваць велізарныя поспехі нашай соцыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Наша партыя, Ленін, Сталін заўсёды ставілі ў цэнтры ўвагі пытанні палітыкі партыі на вёсцы, пытанне саюза рабочага класа з сялянствам, надаючы выключнае значэнне соцыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Грузія, таксама як і многія іншыя «акраіны» царскай Расіі, якая была пад двайным гнётам царызма і сваіх памешчыкаў — феадалаў, Грузія, у мінулым жабрацкая, разароная і бяспраўная, — цяпер пад кіраўніцтвам партыі бальшэвікоў ператварылася ў адну з перадавых квітнеючых рэспублік Совецкага Саюза.

Прыродныя багацці Грузіі выключна разнастайны і толькі пры совецкай уладзе стала магчымым скарыстаць іх і паставіць на службу працоўным.

Каштоўнейшыя субтрапічныя, спецыяльныя і тэхнічныя культуры — чай, цытрусы, табак, вінаград, благародны лаўр, тунг, рамі і іншыя — трывала ўвайшлі ў сельскую гаспадарку Грузіі. Да совецкай улады ў Грузіі было ўсяго некалькі сот гектараў чаю. У сучасны момант чайныя плантацыі ўраслі да 44 тысяч гектараў. У бліжэйшыя 2—3 годы мы задаволім грузінскім чаем усю патрэбнасць працоўных Совецкага Саюза.

У 1937 годзе мы загатовілі 300 мільёнаў штук цытрусавых пладоў супроць 11 мільёнаў штук у 1932 годзе. 22 тысячы гектараў табачных плантацый Грузіі дадуць у бягучым годзе табачным фабрыкам Совецкага Саюза звыш 16 тысяч тон табаку.

Плошча пад вінаграднікамі ў сучасны момант складае каля 45 тысяч гектараў і к 1942 году гэта плошча ўзрасце яшчэ на 20 тысяч з лішнім гектараў. Рад іншых каштоўнейшых культур — тунг, рамі, эўкаліпты, эфіраносныя і інш. толькі пры совецкай уладзе пачалі развівацца ў прамысловым маштабе.

Арганізацыя Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі дасць магчымасць нам паказаць дасягненні соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, дапаможа абмяняцца вопытам работы, паслужыць справе барацьбы за далейшае ўмацаванне калгаснага ладу, новага ўздыму соцыялістычнай гаспадаркі.

Далей дэпутат Берыя адзначае вялікую арганізацыйную неразбярыху ў рабоце Выставачнага камітэта, ведамы ў рабоце Наркамзема СССР па арганізацыі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

— Лічу зусім правільнай, — гаворыць тав. Берыя, — прапанову, унесеную дэпутатам Хрушчовым ад імя групы дэпутатаў УССР, — аб перанясенні тэрміну адкрыцця Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі на 1939 год. Гэта дасць магчымасць як нам, так і ўсім іншым рэспублікам, краям і абласцям, лепш падрыхтавацца і значна паўней прадставіць на выстаўцы свае поспехі ў галіне сельскай гаспадаркі.

Прапанову аб перанясенні на 1 жніўня 1939 г. тэрміну адкрыцця Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі падтрымлівае дэпутат **Маркін** Д. Ф.

Велізарнае значэнне Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі падкрэслівае ў сваёй прамове дэпутат **Каратноў** С. К. Ен расказвае аб карэнных зменах, якія адбыліся ў чувашскай вёсцы. Калгасы, прымяняючы агратэхніку і навейшую механізацыю, пачалі атрымліваць небывалыя ўраджаі. Калгас імя Сталіна ў Вурнарскім раёне, Чувашскай АССР, у 1937 г. выдаў на працадзень 13 кілограмаў зярна. Сто гаспадарак атрымалі хлеба ад 300 да 400 пудоў, а сто гаспадарак — ад 400 да 1000 пудоў. Чувашская рэспубліка і ўся наша краіна маюць тысячы і дзесяткі тысяч выдатна працуючых калгасаў.

Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка павінна адлюстраваць нашы поспехі ў сельскай гаспадарцы, зрабіць здабыткам усёй краіны вопыт перадавых калгасаў і калгаснікаў. Выстаўка падыме яшчэ вышэй сцяг соцыялістычнага спаборніцтва ў барацьбе за 7—8 мільярдаў пудоў зярна ў год.

Выступае дэпутат **Юркін** Т. А.—Народны Камісар Зернавых і Жывёлагадоўчых Саўгасаў СССР. Ен гаворыць аб той

Працяг на 2-й стар.

Другая Сесія Вярхоўнага Савета СССР 1-га склікання

ДЗЕННІК ПАСЯДЖЭННЯЎ СЕСІІ 21 жніўня 1938 г.

Працяг

вялікай рабоце, якую праластаіць прарабіць па падрыхтоўцы да Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Велізарная колькасць жадаючых падала заявы аб удзеле на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Іх аказалася звыш 60 тысяч. Аднак, Галоўны выставачны камітэт, Наркамзем і Наркомсоўгасаў не ўзначалілі разгарнуўшагася сопыялістычнага спаборніцтва, не аказалі неабходнай дапамогі калгасам у гэтай справе. Ворагі народа прабавалі сарваць сопыялістычнае спаборніцтва і масавы ўдзел на выстаўцы перадавікоў сельскай гаспадаркі пад выглядам прыпягнення на выстаўку асоб, даўшых рэкордныя паказальнікі. Многія калгасы і соўгасы, перадавікі сельскай гаспадаркі, па сваіх дасягненнях мелі права ўдзелу на выстаўцы, але афармленне іх заявак па віне Выстаўкома і зямельных органаў не было праведзена. З другога боку, з-за няправільна ўстаноўленых паказальнікаў па абласцях, краях і рэспубліках частка калгасаў, соўгасаў і машынна-трактарных станцый маглі прымаць удзел на выстаўцы па галінах, не маючых для іх асаблівага значэння. Па прапанове Соўнаркома СССР паказальнікі ўдзелу на выстаўцы пераглядаюцца.

Дэпутат **Канусцаеў** Ш. расказвае аб бурным уздыме сярод калгаснікаў, калгасніц, трактарыстаў і камбайнераў, які выклікала падрыхтоўка да Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Кожны калгас Казахскай рэспублікі імкнецца паказаць свае вялікія дасягненні ў барацьбе за ўраджай і развіццё сопыялістычнай жывёлагадоўлі.

Калгасныя палі Казахстана апрацоўваюцца 370 машынна-трактарнымі станцыямі. Замест качавога, бескультурнага, старога аула ў рэспубліцы створаны аснашчоныя навейшай тэхнікай 70.000 калгасаў, якія будуюць свабоднае, шчаслівае і радаснае жыццё. Сярод іх — дзесяткі калгасаў-мільянераў.

Тав. Канусцаеў падтрымлівае прапанову групы дэпутатаў Украіны аб перанясенні выстаўкі на 1939 год.

Пасля кароткага перапынку пасяджэнне аднаўляецца.

Паяўленне ў ложах таварышаў Сталіна, Молатава, Кагановіча, Варашылава, Калініна, Мікаяна, Ждачава, Ежова, Хрушчова, Маленкова, Шкіратава сустракаецца бурнымі, доўга незмаўкаючымі апладысментамі, пераходзячымі ў авацыю. Усе ўстаюць. Раздаюцца воклічы ў гонар таварыша Сталіна: «Таварышу Сталіну — ура!», «Вялікаму Сталіну—ура!».

Прадаўжаюцца спрэчкі па дакладу дэпутата **Хрушчова** Н. С. Выступае Намеснік Народнага Камісара земляробства СССР тав. **Бенедзіктаў**. Ен паведамляе, што Савецкі Саюз цвёрда заняў першае месца ў свеце па вытворчасці пшаніцы, жыта, аўса, ячменю, ільну, цукровых буракоў і бульбы. Прырост сельскагаспадарчай прадукцыі за 1937 год у калгасах склаў 25 процантаў у параўнанні з 1936 годам.

— Рашэнне партыі і ўрада аб арганізацыі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, — гаворыць тав. Бенедзіктаў, — знайшло гарачы водгук сярод калгаснікаў, калгасніц, рабочых і работніц машынна-трактарных станцый і спецыялістаў сельскай гаспадаркі. У рэспубліках, краях і абласцях у выставачныя камітэты паступіла 60 тысяч заяў аб жаданні прымаць удзел у выстаўцы. Але падрыхтоўка да Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі праводзілася Галоўным выставачным камітэтам і Народным Камісарыятам Земляробства Саюза нездавальняюча.

Матэрыялы, прадстаўленыя ў Выставачны камітэт па раду рэспублік, краёў і абласцей, не адлюстроўваюць сапраўдных дасягненняў нашай сельскай гаспадаркі.

У рэзультаце нездавальняючага кіраўніцтва Выставачнага камітэта і Наркамзема Саюза і шкодніцтва на выстаўцы, будаўніцтва не было праведзена без прадуманага генеральнага плана.

На трыбуне дэпутат **Ціцін** Н. В. Ен гаворыць аб велізарным шляху, пройдзеным краінай з часу Першай сельскагаспадарчай выстаўкі ў 1923 годзе.

— Гэта першая выстаўка яшчэ тады з перакананальнай яснасцю паказала сялянам адзіна правільны шлях, намечаны вялікай партыяй Леніна — Сталіна, шлях выхаду з галечы і кулацкай кабалы праз вытворчае каапераванне дробных раздробленых сялянскіх гаспадарак.

— Усяго некалькі год таму назад хіба хто з нас мог дапусціць такую думку, што адзін чалавек за адзін дзень зможа ўбраць з поля столькі хлеба, колькі ўбіралі раней сто чалавек. Цяпер у краіне ўжо не адзінкі, а сотні і тысячы выдатных майстраў камбайнавання.

— Ураджай у 300—400 цэнтнераў буракоў лічыўся ў навуцы максімальным, а то і недасягальным. А вось знатная стаханаўка Мядзведзева Аграфена Пракоп'еўна ў Тульскай вобласці атрымала з гектара 1.000 цэнтнераў буракоў. Вось з такімі людзьмі, нам, вядома, ёсць што паказаць на выстаўцы!

Тав. Ціцін адзначае буйнейшыя недахопы ў падрыхтоўцы выстаўкі. Чыноўніцкі падыход да адбору кандыдатаў прывёў да таго, што Украіна, напрыклад, была-б прадстаўлена на выстаўцы як вядучая па бавоўне рэспубліка, Чувашыя — па зярну і т. д. і т. п.

Заканчваючы сваё выступленне, тав. Ціцін гаворыць:

— Выстаўка 1939 года павінна стаць сапраўды сопыялістычнай школай для мільёнаў калгаснікаў, навуковых работнікаў, аграномаў, інжынераў сельскай гаспадаркі, для ўсіх людзей, звязаных з сельскай гаспадаркай нашай краіны, бо на выстаўцы будзе паказана, на што здольна мысль людзей навукі і практыкі свабоднай краіны Советаў.

Пасля прамовы дэпутата Ціціна спрэчкі спыняюцца і Вярхоўны Совет СССР заслухоўвае заключнае слова дакладчыка — дэпутата **Хрушчова** Н. С.

Раздзельным галасаваннем па палатах Вярхоўны Совет СССР аднагалосна зацвярджае «Закон аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы».

Вярхоўны Совет СССР пераходзіць да разгляду апошняга—восьмага пункта парадку дня.

Слова атрымлівае Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР дэпутат **Горкін** А. Ф.

Тав. Горкін дакладвае Сесіі аб тым, якія Указы былі прыняты Прэзідыумам Вярхоўнага Совета ў перыяд паміж Першай і Другой Сесіямі, належачыя зацвярджэнню Вярхоўнага Совета СССР. Ен называе Указы:

аб амністыі ў азнаменаванне 20-годдзя Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі;

аб аслабаненні ад пасад Народных Камісараў СССР — А. В. Бакуліна, Н. І. Пахомава, М. В. Папова, А. Д. Бruскіна, А. Л. Гілінскага;

аб назначэнні тав. Л. М. Кагановіча Народным Камісарам Шляхоў Зносін па сумяшчэнню з работай Народнага Камісара Цяжкай Прамысловасці, тав. Н. І. Ежова — Народным Камісарам Воднага Транспарта па сумяшчэнню з работай Народнага Камісара Унутраных Спраў, тав. С. Е. Скрыннікава — Народным Камісарам Загатовак, тав. В. К. Львова — Народным Камісарам Машынабудаўніцтва, тав. І. Г. Кабанава — Народным Камісарам Харчовай Прамысловасці;

аб назначэнні тав. Л. М. Кагановіча — Намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў СССР з пакіданнем яго Народным Камісарам Цяжкай Прамысловасці і Народным Камісарам Шляхоў Зносін;

аб утварэнні ў саставе РСФСР Мурманскай вобласці і ў саставе Украінскай ССР — Сталінскай і Варашылаўградскай абласцей.

Вярхоўны Совет СССР аднагалосна зацвярджае гэтыя Указы. Апрача таго, раздзельным галасаваннем па палатах аднагалосна прымаецца пастанова аб змене і дапаўненні артыкулаў 22 і 23 Канстытуцыі (Асноўнага закона) СССР, у сувязі з рашэннямі Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

Старшынствуючы — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Шверпік** Н. М. паведамляе, што парадак дня Другой Сесіі вычарпан і абвяшчае Другую Сесію Вярхоўнага Совета Саюза ССР закрытай.

(БЕЛТА).



У АДПАЧЫНКУ.

НА ЗДЫМКУ: працоўныя адпачываюць у Чонкаўскім доме адпачынку.

Фотаэцюд Шаевіча (Союзфото).

Законы, прынятыя Вярхоўным Советам СССР

ЗАКОН АБ АДЗІНЫМ ДЗЯРЖАЎНЫМ БЮДЖЭЦЕ САЮЗА СОВЕЦКІХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК НА 1938 ГОД

Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік **пастанаўляе:**

1. Зацвердзіць прадстаўлены Советам Народных Камісараў СССР адзіны дзяржаўны бюджэт СССР на 1938 год з прынятымі па дакладах Бюджэтных Камісій Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей зменамі, а імення ўсяго па даходах — 132.637.993 тыс. руб. і ўсяго па расходах — 131.137.993 тыс. руб. з перавышэннем даходаў над расходамі ў суме 1.500.000 тыс. руб.

2. У адпаведнасці з артыкулам 1-м гэтага закона зацвердзіць даходы і расходы саюзнага бюджэта па даходах у суме 97.878.963 тыс. руб. і па расходах у суме—96.378.963 тыс. руб., з перавышэннем даходаў над расходамі ў суме—1.500.000 тыс. руб.

3. Зацвердзіць дзяржаўныя бюджэты саюзных рэспублік на 1938 год у наступных сумах:

	Па даходах (у тыс. руб.)	Па расходах (у тыс. руб.)
Расійская Совецкая Федэратыўная Соцыялістычная Рэспубліка	21.406.731	21.406.731
З іх:		
Рэспубліканскі бюджэт	15.480.076	3.844.894
Мясцовыя бюджэты	5.926.655	17.561.837
Украінская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	5.977.218	5.977.218
З іх:		
Рэспубліканскі бюджэт	4.462.583	1.451.792
Мясцовыя бюджэты	1.514.635	4.525.426
Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	1.167.210	1.167.210
З іх:		
Рэспубліканскі бюджэт	1.022.220	460.827
Мясцовыя бюджэты	144.990	706.383
Азербайджанская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	915.723	915.723
З іх:		
Рэспубліканскі бюджэт	762.496	356.207
Мясцовыя бюджэты	153.227	559.516
Грузінская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	1.068.637	1.068.637
З іх:		
Рэспубліканскі бюджэт	914.568	466.711
Мясцовыя бюджэты	154.069	601.926
Армянская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	388.427	388.427
З іх:		
Рэспубліканскі бюджэт	348.216	182.861
Мясцовыя бюджэты	40.211	205.566
Туркменская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	441.284	441.284
З іх:		
Рэспубліканскі бюджэт	383.906	206.427
Мясцовыя бюджэты	57.378	234.857
Узбекская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	1.314.693	1.314.693
З іх:		
Рэспубліканскі бюджэт	1.100.402	613.765
Мясцовыя бюджэты	214.291	700.928
Таджыкская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	448.928	448.928
З іх:		
Рэспубліканскі бюджэт	407.148	211.286
Мясцовыя бюджэты	41.780	237.642
Казахская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	1.282.602	1.282.602
З іх:		
Рэспубліканскі бюджэт	1.157.903	466.469
Мясцовыя бюджэты	124.699	816.133
Кіргізская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	347.577	347.577
З іх:		
Рэспубліканскі бюджэт	312.844	153.797
Мясцовыя бюджэты	34.733	193.780
Разам па дзяржаўных бюджэтах Саюзных рэспублік	34.759.030	34.759.030
З іх:		
Рэспубліканскія бюджэты	26.352.362	8.415.036
Мясцовыя бюджэты	8.406.668	26.343.994

4. Зацвердзіць адлічэнні з рэспубліканскіх бюджэтаў у бюджэты АССР і мясцовых советаў у наступных сумах:

	У тыс. руб.
Расійская Совецкая Федэратыўная Соцыялістычная Рэспубліка	11.635.182
Украінская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	3.010.791
Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	561.393
Азербайджанская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	406.289
Грузінская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	447.857
Армянская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	165.355
Туркменская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	177.479
Узбекская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	486.637
Таджыкская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	105.862
Казахская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	691.434
Кіргізская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка	159.047
РАЗАМ	17.937.326

5. Устанавіць на 1938 год адлічэнні ад агульнасаюзных дзяржаўных падаткаў у рэспубліканскія і мясцовыя бюджэты ў наступных размерах:

а) ад збору ў гарадах на патрэбы жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва па РСФСР, Украінскай ССР, Беларускай ССР, Азербайджанскай ССР, Грузінскай ССР, Армянскай ССР і Узбекскай ССР—50 проц, і па астатніх саюзных рэспубліках — 100 проц.;

б) ад збору на патрэбы жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва ў сельскіх мясцовасцях па ўсіх саюзных рэспубліках — 100 проц.;

в) ад паступленняў па падаходнаму падатку з калгасаў і сельскагаспадарчаму падатку з калгаснікаў і аднаасобнікаў—па РСФСР, УССР і БССР—75 процантаў і па астатніх рэспубліках—100 проц.

6. Даручыць Совету Народных Камісараў СССР у адпаведнасці з зацверджанымі Вярхоўным Советам СССР сумамі адлічэнняў саюзным рэспублікам ад падатку з абароту, устанавіць па кожнай саюзнай рэспубліцы проценты адлічэнняў ад гэтага падатку.

7. Адзначыць нездавальняючую арганізацыю спагнання Наркамфінам СССР і яго мясцовымі органамі ўстаноўленых законам сельскіх падаткаў і збораў у 1937 годзе.

Абавязаць Наркамфін СССР і мясцовыя совецкія органы прыняць меры да паляпшэння работы фінансавых органаў.

8. Прапанаваць Совету Народных Камісараў СССР унесці на зацвярджэнне наступнай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР праект закона аб адзіным дзяржаўным бюджэце СССР, які прадугледжвае ўстанаўленне больш устойлівых крыніц даходаў па рэспубліканскіх і мясцовых бюджэтах.

9. Даручыць Совету Народных Камісараў СССР прадставіць у Вярхоўны Совет СССР не пазней 15 снежня 1938 года праект адзінага дзяржаўнага бюджэта СССР на 1939 год.

10. Зацвердзіць справаздачу аб выкананні дзяржаўнага бюджэта СССР за 1936 год па даходах—83.760.252.898 руб. і па расходах—81.827.108.678 руб., з перавышэннем даходаў над расходамі ў суме 1.933.144.220 рублёў.

Масква, Крэмль, 19 жніўня 1938 г.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

ЗАКОН АБ СУДАУСТРОЙСТВЕ СССР, САЮЗНЫХ І АЎТАНОМНЫХ РЭСПУБЛІК

I

АГУЛЬНАЕ ПАЛАЖЭННЕ

Артыкул 1. У адпаведнасці з арт. 102 Канстытуцыі СССР правасуддзе ў СССР ажыццяўляецца Вярхоўным Судом СССР, Вярхоўнымі Судамі Саюзных Рэспублік, краявымі і абласнымі судамі, судамі Аўтаномных рэспублік і аўтаномных абласцей, акруговымі судамі, спецыяльнымі судамі СССР, ствараемымі паводле пастановы Вярхоўнага Совета СССР, народнымі судамі.

Артыкул 2. Правасуддзе ў СССР мае сваёй задачай абарону ад усякіх пасяганняў:

а) устаноўленага Канстытуцыяй СССР і Канстытуцыямі Саюзных і Аўтаномных рэспублік грамадскага і дзяржаўнага ўстройства СССР, сопыялістычнай сістэмы гаспадаркі і сопыялістычнай уласнасці;

б) палітычных, працоўных, жыллёвых і іншых асабістых і маемасных праў і інтарэсаў грамадзян СССР, гарантаваных Канстытуцыяй СССР і Канстытуцыямі Саюзных і Аўтаномных рэспублік;

в) праў і ахоўваемых законам інтарэсаў дзяржаўных устаноў, прадпрыемстваў, калгасаў, кааператыўных і іншых грамадскіх арганізацый.

Правасуддзе ў СССР мае сваёй задачай забеспячэнне дакладнага і няўхільнага выканання совецкіх законаў усімі ўстановамі, арганізацыямі, пасаднымі асобамі і грамадзянамі СССР.

Артыкул 3. Совецкі суд, прымяняючы меры крымінальнага пакарання, не толькі карае злачынцаў, але таксама мае сваёй мэтай выпраўленне і перавыхаванне злачынцаў.

Усёй сваёй дзейнасцю суд выхоўвае грамадзян СССР у духу адданасці радзіме і справе соцыялізма, у духу дакладнага і няўхільнага выканання совецкіх законаў, беражлівых адносін да сопыялістычнай уласнасці, дысцыпліны працы, чэсных адносін да дзяржаўнага і грамадскага абавязку, павагі да правіл сопыялістычнага агульнажыцця.

Артыкул 4. Указаныя ў арт. 2 гэтага закона задачы суды ў СССР ажыццяўляюць шляхам:

а) разбірацельства ў судовых пасяджэннях крымінальных спраў і прымянення ўстаноўленых законам мер пакарання да здраднікаў радзімы, шкоднікаў, раскрадальнікаў сопыялістычнай уласнасці і іншых ворагаў народа, а таксама да грабежнікаў, зладзеяў, хуліганаў і іншых злачынцаў;

б) разбірацельства і вырашэння ў судовых пасяджэннях спраў па спрэчках, якія закранаюць правы і інтарэсы грамадзян, дзяржаўных устаноў, прадпрыемстваў, калгасаў і іншых грамадскіх арганізацый.

Артыкул 5. Правасуддзе ў СССР ажыццяўляецца на пачатках:

а) адзінага і роўнага для ўсіх грамадзян суда, незалежна ад сопыяльнага, маемаснага і службовага становішча грамадзян, іх нацыянальнай і расавай прыналежнасці;

б) адзінага і абавязковага для ўсіх судоў крымінальнага, грамадзянскага і працэсуальнага заканадаўства СССР.

Артыкул 6. Суддзі незалежны і падпарадкуюцца толькі закону (арт. 112 Канстытуцыі СССР).

Артыкул 7. У адпаведнасці з арт. 110 Канстытуцыі СССР судаводзенне праводзіцца ў СССР на мове Саюзнай або Аўтаномнай рэспублікі або Аўтаномнай вобласці з забеспячэннем для асоб, не валодаючых гэтай мовай, поўнага азнаямлення з матэрыяламі справы праз перакладчыка, а таксама права выступаць на судзе на роднай мове.

Артыкул 8. У адпаведнасці з арт. 111 Канстытуцыі СССР разбірацельства спраў ва ўсіх судах СССР адкрытае, паколькі законам не прадугледжаны выключэнні з забеспячэннем абвінавачваемаму права на абарону.

Артыкул 9. У адпаведнасці з арт. 103 Канстытуцыі СССР разгляд спраў ва ўсіх судах СССР ажыццяўляецца з удзелам народных засядацеляў, апрача выпадкаў, спецыяльна прадугледжаных законам.

Артыкул 10. У адпаведнасці з арт. арт. 105, 106, 107, 108 і 109 Канстытуцыі СССР суды ў СССР утвараюцца на пачатках выбарнасці ў парадку, устаноўленым гэтым законам.

Артыкул 11. Суддзямі і народнымі засядацелямі могуць быць усе грамадзяне, якія карыстаюцца выбарчымі правамі.

Артыкул 12. Народныя засядацелі заклікаюцца да выканання сваіх абавязкаў у судах у парадку чарговасці па спіску не больш, чым на 10 дзён у годзе, апрача выпадкаў, калі прадоўжанне гэтага тэрміну выклікаецца неабходнасцю ўдзелу народных засядацеляў у разглядзе судовай справы.

У часе выканання сваіх абавязкаў у судзе народныя засядацелі карыстаюцца ўсімі правамі суддзі.

Артыкул 13. За народнымі засядацелямі з ліку рабочых і служачых на ўвесь час выканання імі абавязкаў у судзе захоўваецца іх заработная плата. Ва ўсіх астатніх выпадках аплата народным засядацелям расходаў, звязаных з выкананнем іх абавязкаў у судзе, праводзіцца ў парадку, устанаўліваемым заканадаўствам Саюзных рэспублік.

Артыкул 14. Разгляд спраў ва ўсіх судах ажыццяўляецца ў саставе суддзі і двух народных засядацеляў, апрача выпадкаў, спецыяльна прадугледжаных законам, калі гэтае разбірацельства ажыццяўляецца трыма членамі суда.

Артыкул 15. Прыгаворы, рашэнні і вызначэнні ўсіх судоў, апрача Вярхоўнага Суда СССР і Вярхоўных судоў Саюзных рэспублік, могуць быць ва ўстаноўленым законам парадку абскарджаны асуджанымі, іх абаронцамі, істцамі, адказчыкамі і прадстаўнікамі іх інтарэсаў ці апратэстованы пракурорам у вышэйстаячы суд.

Пры разглядзе скарг і пратэстаў вышэйстаячы суд па наяўных у справе і прадстаўленых старанамі матэрыялах правярае законнасць і абгрунтаванасць вынесенага ніжэйстаячым судом прыгавору ці рашэння.

Артыкул 16. Судовыя прыгаворы, рашэнні і вызначэнні, уступіўшыя ў законную сілу, могуць быць апратэстованы толькі Пракурорам СССР ці Пракурорам Саюзнай рэспублікі, Старшынёй Вярхоўнага Суда СССР і Старшынёй Вярхоўнага Суда Саюзнай рэспублікі, у адпаведнасці з арт. арт. 51, 64, 74 гэтага закона.

Артыкул 17. Вызваленне суддзяў ад пасады і народных засядацеляў ад іх абавязкаў дапускаецца не інакш, як па адкліканню выбаршчыкаў або ў сілу адбыўшагася аб іх прыгавору суда.

Артыкул 18. Узбуджэнне супроць суддзяў крымінальнага праследавання, знятце іх у сувязі з гэтым пасады і адданне суду робіцца:

у адносінах народных суддзяў, членаў краявых, абласных, акруговых судоў, судоў Аўтаномных абласцей, членаў Вярхоўных судоў Саюзных і Аўтаномных рэспублік — па пастанове Пракурора Саюзнай рэспублікі з санкцыі Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюзнай рэспублікі;

у адносінах членаў Вярхоўнага Суда СССР і спецыяльных судоў СССР—па пастанове Пракурора СССР з санкцыі Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

Артыкул 19. У выпадку часовай адсутнасці народнага суддзі (хваробы, водпуску і т. д.) выкананне абавязкаў суддзі на час яго адсутнасці ўскладаецца раённым Советам Дэпутатаў Працоўных на аднаго з народных засядацеляў.

Артыкул 20. У выпадку выбыцця народнага суддзі да сканчэння тэрміну яго поўнамоцтваў новыя выбары народнага суддзі арганізоўваюцца не пазней двухмесячнага тэрміну з дня выбыцця.

Новыя выбары народнага суддзі арганізоўваюцца Народным Камісарыятам Юстыцыі Саюзнай рэспублікі, а ў аўтаномнай рэспубліцы — Народным Камісарыятам Юстыцыі Аўтаномнай рэспублікі.

У выпадку выбыцця членаў акруговых, краявых, абласных і Вярхоўных судоў Саюзных і Аўтаномных рэспублік, а таксама членаў спецыяльных судоў і Вярхоўнага Суда СССР, выбары новых членаў судоў праводзяцца на чарговай сесіі Советаў Дэпутатаў Працоўных вобласці, края, акругі, Вярхоўнага Совета Саюзнай і Аўтаномнай рэспублікі, Вярхоўнага Совета СССР.

II

НАРОДНЫ СУД

Артыкул 21. Народны суд разглядае:

а) крымінальныя справы —

аб злачынствах супроць жыцця, здароўя, свабоды і дастоінства грамадзян — аб забойствах, нанясенні цялесных пашкоджанняў, утварэнні незаконных абортаў, незаконным пазбаўленні свабоды, згвалтаванні, злосным неплацяжы аліментаў, знявазе, хуліганстве, паклёпу;

аб маемасных злачынствах — разбоі, грабяжы, пакражах, махлярстве, вымаганні;

аб службовых злачынствах пасадных асоб — злоўжыванні ўладай, перавышэнні ўлады, бяздзейнасці ўлады, растратах, безгаспадарчасці, падлогах, абважванні і абмерванні, перавышэнні цэн;

аб злачынствах супроць парадку кіравання — парушэнні выбарчага закона, злосным неплацяжы ўстаноўленых законам падаткаў і збораў, адмаўленні ад выканання дзяржаўных пастаноў і павіннасцей, ухіленні ад прызыва і ад абавязкаў ваеннай службы, парушэнні законных распараджэнняў органаў улады;

б) грамадзянскія справы —

па іскох аб маемасці,

па іскох, звязаных з парушэннем законаў аб працы,

па іскох аб уплаце аліментаў;

па іскох аб спадчыне,

і іншыя крымінальныя і грамадзянскія справы, аднесеныя законам да яго ведання.

Артыкул 22. На падставе артыкула

(Працяг на 3-й стар.).

Другая Сесія Вярхоўнага Совета СССР 1-га склікання

Законы, прынятыя Вярхоўным Советам СССР

ЗАКОН АБ СУДАУСТРОЙСТВЕ СССР, САЮЗНЫХ І АЎТАНОМНЫХ РЭСПУБЛІК

Працяг

109 Канстытуцыі СССР народныя суды выбіраюцца грамадзянамі раёна на аснове ўсеагульнага, прамога і роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні тэрмінам на 3 годы.

Артыкул 23. Народныя суддзі і народныя засядацелі выбіраюцца грамадзянамі раёнаў па выбарчых акругах. Выбарчая акруга па выбарах народных суддзяў і народных засядацеляў ахапляе ўсё насельніцтва, пражываючае на тэрыторыі дзейнасці данага народнага суда.

Артыкул 24. Права выстаўлення кандыдатаў у народныя суддзі і народныя засядацелі забяспечваецца за грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных: комуністычнымі партыйнымі арганізацыямі, прафесіянальнымі саюзамі, кааператывамі, арганізацыямі моладзі, культурнымі таварыствамі, а таксама агульнымі сходамі рабочых і служачых—па прадпрыемствах, ваеннаслужачых — па вайсковых часцях, агульнымі сходамі сялян — па калгасах, рабочых і служачых соўгасаў — па соўгасах.

Артыкул 25. Парадак рэгістрацыі кандыдатаў і апублікавання спіскаў кандыдатаў у народныя суддзі і народныя засядацелі, а таксама тэрміны і парадак іх выбараў вызначаюцца «Палажэннямі аб выбарах суддзяў і народных засядацеляў», зацвярджаемымі Вярхоўнымі Советамі Саюзных рэспублік.

Артыкул 26. Колькасць народных судоў для кожнага раёна ўстанаўліваецца Советам Народных Камісараў Саюзнай рэспублікі па прадстаўленню Народнага Камісара Юстыцыі Саюзнай рэспублікі. У аўтаномных рэспубліках колькасць народных судоў для кожнага раёна ўстанаўліваецца Советам Народных Камісараў Аўтаномнай рэспублікі па прадстаўленню Народнага Камісара Юстыцыі Аўтаномнай рэспублікі.

Артыкул 27. Народны суд да разгляду справы ў судовым пасяджэнні:

а) зацвярджае абвінаваўчае заключэнне, прадстаўленае пракурорам. Пры нязгодзе з абвінаваўчым заключэннем, народны суд мае права вярнуць справу пракурору на даследванне, або спыніць вядзенне справы пры наяўнасці да гэтага дастатковых падстаў;

б) вырашае пытанне аб заключэнні абвінавачваемага пад варту або аслабаненні яго з-пад варты;

в) выносіць рашэнне аб абавязковым удзеле пры разглядзе справы абаронцы і пракурора.

Артыкул 28. Народны суддзя:

а) па паступіўшых скаргах і заявах выносіць пастанову аб узбуджэнні крымінальнага праследвання, ці аб адмове ў гэтым;

б) у выпадку неабходнасці, накіроўвае заявы ці скаргі следчым органам для расследвання;

в) назначае справы да слухання;

г) робіць распараджэнні аб выкліку ў суд абвінавачваемых, сведак, экспертаў і паведамляе аб часе разгляду справы істцоў і адказчыкаў;

д) старшынствуе ў пасяджэннях народнага суда.

Артыкул 29. Народныя суддзі адчытваюцца перад выбаршчыкамі ў сваёй рабоце і рабоце народнага суда.

III
КРАЯВЫ, АБЛАСНЫ, АКРУГОВЫ СУД І СУД АЎТАНОМНАЙ ВОБЛАСЦІ

Артыкул 30. У адпаведнасці з арт. 108 Канстытуцыі СССР краявы, абласны, акруговы суд і суд Аўтаномнай вобласці выбіраецца краявым, абласным, акруговым Советам Дэпутатаў Працоўных або Советам Дэпутатаў Працоўных Аўтаномнай вобласці тэрмінам на пяць год.

Артыкул 31. Краявы, абласны, акруговы суд і суд Аўтаномнай вобласці складаецца з старшыні, намеснікаў старшыні, членаў суда і народных засядацеляў, заклікаемых для ўдзелу ў разглядзе судовых спраў.

Артыкул 32. Краявы, абласны, акруговы суд і суд Аўтаномнай вобласці разглядаюць аднесеныя законам да іх ведання крымінальныя справы аб контррэволюцыйных злачынствах, аб асабліва небяспечных злачынствах супроць дзяржаўнага кіравання, аб раскраданнях социялістычнай уласнасці, аб асабліва важных пасадных і гаспадарчых злачынствах, а таксама аднесеныя законам да іх ведання грамадзянскія справы па спрэчках паміж дзяржаўнымі і грамадскімі ўстановамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі.

Краявы, абласны, акруговы суд і суд Аўтаномнай вобласці разглядаюць апрача таго скаргі і пратэсты на прыгаворы, рашэнні і вызначэнні народных судоў.

Артыкул 33. У саставе краявога, абласнога, акруговага суда і суда Аўтаномнай вобласці дзейнічаюць:

а) судовая калегія па крымінальных справах — для разгляду крымінальных спраў, падсудных краявому, абласному, акруговаму суду і суду Аўтаномнай вобласці, а таксама для разгляду скарг і пратэстаў на прыгаворы і вызначэнні народных судоў;

б) судовая калегія па грамадзянскіх справах — для разгляду грамадзянскіх спраў, падсудных краявому, абласному, акруговаму суду і суду Аўтаномнай вобласці, а таксама для разгляду скарг і пратэстаў на рашэнні і вызначэнні народных судоў.

Артыкул 34. Судовыя калегіі краявога, абласнога, акруговага суда і суда Аўтаномнай вобласці разглядаюць крымінальныя грамадзянскія справы ў саставе старшынствуючага — старшыні ці члена суда і двух народных засядацеляў.

Артыкул 35. Судовыя калегіі краявога, абласнога, акруговага суда, суда Аўтаномнай вобласці разглядаюць скаргі і пратэсты на прыгаворы, рашэнні і вызначэнні народных судоў у саставе трох членаў адпаведнага суда.

Артыкул 36. У абласцях, якія ўваходзяць у састаў края, акруговыя і абласныя суды дзейнічаюць у тым-жа саставе, што і краявы суд.

Артыкул 37. Старшыня краявога, абласнога, акруговага суда і суда Аўтаномнай вобласці старшынствуе ў судовых пасяджэннях або назначае для старшынствавання ў судовых пасяджэннях члена краявога, абласнога, акруговага суда і суда Аўтаномнай вобласці, назначае справы да слухання, дае распараджэнні аб выкліку ў суд абвінавачваемых, сведак, экспертаў і паведамляе аб часе разгляду справы істцоў і адказчыкаў.

IV
ВЯРХОЎНЫ СУД АЎТАНОМНАЙ РЭСПУБЛІКІ

Артыкул 38. У адпаведнасці з арт. 107 Канстытуцыі СССР Вярхоўны суд Аўтаномнай рэспублікі выбіраецца Вярхоўным Советам Аўтаномнай рэспублікі тэрмінам на 5 год.

Артыкул 39. Вярхоўны суд Аўтаномнай рэспублікі складаецца з старшыні, намеснікаў старшыні, членаў суда і народных засядацеляў, заклікаемых да ўдзелу ў разглядзе судовых спраў.

Артыкул 40. Вярхоўны суд Аўтаномнай рэспублікі разглядае аднесеныя законам да яго ведання крымінальныя справы аб контррэволюцыйных злачынствах, аб асабліва небяспечных злачынствах супроць дзяржаўнага кіравання, аб раскраданнях социялістычнай уласнасці, аб асабліва важных пасадных і гаспадарчых злачынствах, а таксама аднесеныя законам да яго ведання грамадзянскія справы па спрэчках паміж дзяржаўнымі і грамадскімі ўстановамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі.

Вярхоўны суд Аўтаномнай рэспублікі разглядае апрача таго скаргі і пратэсты на прыгаворы, рашэнні і вызначэнні народных судоў.

Артыкул 41. У саставе Вярхоўнага суда Аўтаномнай рэспублікі дзейнічаюць:

а) судовая калегія па крымінальных справах для разгляду крымінальных спраў, аднесеных законам да ведання Вярхоўнага суда Аўтаномнай рэспублікі, а таксама для разгляду скарг і пратэстаў на прыгаворы і вызначэнні народных судоў;

б) судовая калегія па грамадзянскіх справах для разгляду грамадзянскіх спраў, аднесеных законам да ведання Вярхоўнага суда Аўтаномнай рэспублікі, а таксама для разгляду скарг і пратэстаў на рашэнні і вызначэнні народных судоў.

Артыкул 42. Судовыя калегіі Вярхоўнага суда Аўтаномнай рэспублікі разглядаюць справы ў саставе старшынствуючага—старшыні ці члена Вярхоўнага суда і двух народных засядацеляў.

Артыкул 43. Судовыя калегіі Вярхоўнага суда Аўтаномнай рэспублікі разглядаюць скаргі і пратэсты на прыгаворы, рашэнні і вызначэнні народных судоў у саставе трох членаў Вярхоўнага суда Аўтаномнай рэспублікі.

Артыкул 44. Старшыня Вярхоўнага суда Аўтаномнай рэспублікі старшынствуе ў судовых пасяджэннях або назначае для старшынствавання ў судовых пасяджэннях члена Вярхоўнага суда Аўтаномнай рэспублікі, назначае справы да слухання, дае распараджэнні аб выкліку ў суд абвінавачваемых, сведак, экспертаў і паведамляе аб часе разгляду справы істцоў і адказчыкаў.

V
ВЯРХОЎНЫ СУД САЮЗНАЙ РЭСПУБЛІКІ

Артыкул 45. Вярхоўны суд Саюзнай рэспублікі з'яўляецца вышэйшым судовым органам Саюзнай рэспублікі. На Вярхоўны суд Саюзнай рэспублікі ўскладаецца нагляд за судовай дзейнасцю ўсіх судовых органаў Саюзнай рэспублікі, Аўтаномных рэспублік, краёў, абласцей і акруг, якія ўваходзяць у састаў данай Саюзнай рэспублікі.

Артыкул 46. У адпаведнасці з арт. 106 Канстытуцыі СССР Вярхоўны суд Саюзнай рэспублікі выбіраецца Вярхоўным Советам Саюзнай рэспублікі тэрмінам на 5 год.

Артыкул 47. Вярхоўны суд Саюзнай рэспублікі складаецца з старшыні, намеснікаў старшыні, членаў суда і народных засядацеляў, заклікаемых да ўдзелу ў разглядзе судовых спраў.

Артыкул 48. Вярхоўны суд Саюзнай рэспублікі дзейнічае ў саставе:

а) судовай калегіі па крымінальных справах для разгляду крымінальных спраў, аднесеных законам да ведання Вярхоўнага суда Саюзнай рэспублікі, а таксама для разгляду скарг і пратэстаў на прыгаворы і вызначэнні краявых, абласных і іншых судоў Саюзнай рэспублікі;

б) судовай калегіі па грамадзянскіх справах для разгляду грамадзянскіх спраў, аднесеных законам да ведання Вярхоўнага суда Саюзнай рэспублікі, а таксама для разгляду скарг і пратэстаў на рашэнні і вызначэнні краявых, абласных і іншых судоў Саюзнай рэспублікі.

Артыкул 49. Судовыя калегіі Вярхоўнага суда Саюзнай рэспублікі разглядаюць справы ў саставе старшынствуючага — старшыні ці члена Вярхоўнага суда і двух народных засядацеляў.

Артыкул 50. Судовыя калегіі Вярхоўнага суда Саюзнай рэспублікі разглядаюць скаргі і пратэсты на прыгаворы, рашэнні і вызначэнні краявых, абласных і іншых судоў Саюзнай рэспублікі ў саставе трох членаў Вярхоўнага суда.

Артыкул 51. Вярхоўны суд Саюзнай рэспублікі ажыццяўляе нагляд за судовай дзейнасцю судоў рэспублікі шляхам:

а) разгляду пратэстаў Пракурора СССР, Пракурора Саюзнай рэспублікі, Старшыні Вярхоўнага суда СССР, Старшыні Вярхоўнага суда Саюзнай рэспублікі на прыгаворы, рашэнні і вызначэнні, уступіўшыя ў законную сілу;

б) разгляду ў судовых пасяджэннях скарг і пратэстаў па справах, вырашаных судамі Саюзнай рэспублікі.

Артыкул 52. Старшыня Вярхоўнага суда Саюзнай рэспублікі старшынствуе ў судовых пасяджэннях або назначае для старшынствавання ў судовых пасяджэннях члена Вярхоўнага суда Саюзнай рэспублікі, назначае справы да слухання, дае распараджэнні аб выкліканні ў суд абвінавачваемых, сведак, экспертаў і паведамляе аб часе разгляду справы істцоў і адказчыкаў.

VI
СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ СУДЫ СССР

Артыкул 53. На падставе арт. 102 Канстытуцыі СССР дзейнічаюць наступныя спецыяльныя суды СССР:

а) ваенныя трыбуналы;

б) лінейныя суды чыгуначнага транспарта;

в) лінейныя суды воднага транспарта.

Артыкул 54. У адпаведнасці з арт. 105 Канстытуцыі СССР старшыня, намеснікі старшыні, члены спецыяльных судоў СССР выбіраюцца Вярхоўным Советам СССР тэрмінам на пяць год.

Артыкул 55. Для ўдзелу ў судовых пасяджэннях ваенных трыбуналаў, лінейных судоў чыгуначнага і воднага транспарта прыцягваюцца народныя засядацелі, выбіраемыя краявымі і абласнымі Советамі Дэпутатаў працоўных і Вярхоўнымі Советамі Саюзных і Аўтаномных рэспублік.

Артыкул 56. Ваенныя трыбуналы, лінейныя суды чыгуначнага і воднага транспарта разглядаюць справы ў саставе старшынствуючага — старшыні або члена суда і двух народных засядацеляў, апрача выпадкаў, калі па закону справы разглядаюцца ў саставе трох членаў адпаведнага суда.

Артыкул 57. Ваенныя трыбуналы арганізоўваюцца:

а) пры ваенных акругах, франтах і марскіх флотах;

б) пры арміях, карпусах, іншых воінскіх злучэннях і ваенізаваных установах.

Артыкул 58. Ваенныя трыбуналы разглядаюць справы аб воінскіх злачынствах, а таксама аб іншых злачынствах, аднесеных законам да іх ведання.

Артыкул 59. Ваенныя трыбуналы пры акругах, франтах і марскіх флотах разглядаюць крымінальныя справы, аднесеныя законам да іх ведання, а таксама разглядаюць скаргі і пратэсты на прыгаворы па справах, разгледжаных ваеннымі трыбуналамі армій, карпусоў, іншых воінскіх злучэнняў і ваенізаваных устаноў.

Артыкул 60. Лінейныя суды чыгуначнага і воднага транспарта разглядаюць аднесеныя законам да іх ведання справы аб злачынствах, накіраваных на падрыў працоўнай дысцыпліны на транспарце, і аб іншых злачынствах, парушаючых нармальную работу транспарта.

Артыкул 61. Лінейныя суды чыгуначнага і воднага транспарта арганізоўваюцца адпаведна на чыгунках і водных шляхах зносін.

Артыкул 62. Старшыні ваенных трыбуналаў, лінейных судоў чыгуначнага і воднага транспарта старшынствуюць у судовых пасяджэннях або назначаюць для старшынствавання ў судовых пасяджэннях членаў ваенных трыбуналаў і лінейных судоў, назначаюць справы да слухання, даюць распараджэнні аб выкліку ў суд абвінавачваемых, сведак і экспертаў.

VII
ВЯРХОЎНЫ СУД СССР

Артыкул 63. У адпаведнасці з арт. арт. 104 і 105 Канстытуцыі СССР Вярхоўны суд СССР з'яўляецца вышэйшым судовым органам і выбіраецца Вярхоўным Советам СССР тэрмінам на пяць год.

На Вярхоўны суд СССР ускладаецца нагляд за судовай дзейнасцю ўсіх судовых органаў СССР і Саюзных рэспублік.

Артыкул 64. Нагляд за судовай дзейнасцю ўсіх судовых органаў СССР і Саюзных рэспублік Вярхоўны суд ажыццяўляе шляхам:

а) разгляду пратэстаў Пракурора СССР і Старшыні Вярхоўнага суда СССР на прыгаворы, рашэнні і вызначэнні судоў, увайшоўшыя ў законную сілу;

б) разгляду скарг і пратэстаў па справах, разгледжаных ваеннымі трыбуналамі, лінейнымі судамі чыгуначнага і воднага транспарта.

Артыкул 65. Вярхоўны суд СССР складаецца са Старшыні, намеснікаў старшыні, членаў Вярхоўнага суда і народных засядацеляў, заклікаемых да ўдзелу ў разглядзе судовых спраў, і дзейнічае ў саставе:

а) судовай калегіі па крымінальных справах;

б) судовай калегіі па грамадзянскіх справах;

в) ваеннай калегіі;

г) чыгуначнай калегіі;

д) водна-транспартнай калегіі.

Артыкул 66. Судовая калегія Вярхоўнага суда СССР па крымінальных справах разглядае крымінальныя справы, аднесеныя законам да яе ведання, а таксама разглядае пратэсты на прыгаворы і вызначэнні Вярхоўных судоў Саюзных рэспублік.

Артыкул 67. Судовая калегія Вярхоўнага суда СССР па грамадзянскіх справах разглядае грамадзянскія справы, аднесеныя законам да яе ведання, а таксама разглядае пратэсты на рашэнні і вызначэнні Вярхоўных судоў Саюзных рэспублік.

Артыкул 68. Судовыя калегіі Вярхоўнага суда СССР па крымінальных і грамадзянскіх справах разглядаюць справы ў саставе старшынствуючага—старшыні або члена Вярхоўнага суда СССР і двух народных засядацеляў.

Судовыя калегіі Вярхоўнага суда СССР па крымінальных і грамадзянскіх справах разглядаюць пратэсты на прыгаворы, вызначэнні і рашэнні Вярхоўных судоў Саюзных рэспублік у саставе трох членаў Вярхоўнага суда СССР.

Артыкул 69. Ваенная калегія Вярхоўнага суда СССР разглядае справы, аднесеныя законам да яе ведання, а таксама разглядае пратэсты і скаргі на прыгаворы і вызначэнні ваенных трыбуналаў.

Артыкул 70. Ваенная калегія Вярхоўнага суда СССР разглядае справы ў саставе старшынствуючага — старшыні або члена ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР і двух народных засядацеляў, апрача выпадкаў, спецыяльна прадугледжаных крымінальна-працэсуальным кодэксам, калі справы разглядаюцца ў саставе трох членаў ваеннай калегіі.

Ваенная калегія Вярхоўнага суда СССР разглядае пратэсты і скаргі на прыгаворы і вызначэнні ваенных трыбуналаў у саставе трох членаў ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР.

Артыкул 71. Чыгуначная і водна-транспартная калегіі Вярхоўнага суда СССР разглядаюць справы аб злачынствах, аднесеных законам да іх ведання, а таксама разглядаюць пратэсты і скаргі, прынасімыя на прыгаворы і вызначэнні лінейных судоў чыгуначнага і воднага транспарта.

Артыкул 72. Чыгуначная і водна-транспартная калегіі Вярхоўнага суда СССР разглядаюць справы ў саставе старшынствуючага — старшыні або члена адпаведнай калегіі і двух народных засядацеляў.

Артыкул 73. Чыгуначная і водна-транспартная калегіі Вярхоўнага суда СССР разглядаюць пратэсты і скаргі, прынасімыя на прыгаворы і вызначэнні лінейных судоў чыгуначнага і воднага транспарта, у саставе трох членаў адпаведнай калегіі Вярхоўнага суда СССР.

Артыкул 74. Старшыня Вярхоўнага суда СССР можа прыняць на сябе старшынствавание па любой справе, якая знаходзіцца на разглядзе калегіі Вярхоўнага суда СССР.

Старшыня Вярхоўнага суда СССР і Пракурор СССР маюць права вытрабаваць любую справу з любога суда СССР або Саюзных рэспублік і ўнесці па гэтай справе свой пратэст ва ўстаноўленым законам парадку.

Артыкул 75. Для разгляду прынасімых Старшынёй Вярхоўнага суда СССР або Пракурорам СССР пратэстаў на прыгаворы, рашэнні і вызначэнні калегій Вярхоўнага суда СССР склікаецца Пленум Вярхоўнага суда СССР, які таксама дае кіруючыя ўказанні па пытаннях судовай практыкі на падставе рашэнняў, прынятых па разгледжаных Вярхоўным судом СССР судовых справах.

Артыкул 76. Пленум Вярхоўнага суда СССР складаецца са старшыні Вярхоўнага суда СССР, яго намеснікаў і ўсіх членаў Вярхоўнага суда СССР.

Удзел Пракурора СССР у Пленуме абавязковы.

У пасяджэнні Пленума Вярхоўнага суда СССР удзельнічае Народны Камісар Юстыцыі СССР.

Артыкул 77. Пасяджэнні Пленума Вярхоўнага суда СССР склікаюцца не радзей аднаго разу ў два месяцы.

VIII
СУДОВЫЯ ВЫКАНАЎЦЫ

Артыкул 78. Выкананне рашэнняў і вызначэнняў па грамадзянскіх справах і выкананне прыгавораў па крымінальных справах у частцы маемасных спагнанняў праводзіцца судовымі выканаўцамі.

Артыкул 79. Судовыя выканаўцы састаяць пры народных судах, пры акруговых, краявых, абласных судах, судах аўтаномных абласцей, Вярхоўных судах Аўтаномных і Саюзных рэспублік і назначаюцца Народным Камісарыятам Юстыцыі Саюзнай рэспублікі, а ў аўтаномных рэспубліках — Народным Камісарыятам Юстыцыі Аўтаномнай рэспублікі.

Артыкул 80. Прад'яўляемыя судовымі выканаўцамі патрабаванні па выкананню судовых прыгавораў, рашэнняў і вызначэнняў абавязковы для ўсіх пасадавых асоб і грамадзян.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
16 жніўня 1938 г.

АБ ВЫБРАННІ ВЯРХОЎНАГА СУДА Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік

Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Социялістычных рэспублік **пастанаўляе:**

Выбраць Вярхоўны суд Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік у наступным саставе:

СТАРШЫНЯ ВЯРХОЎНАГА СУДА СССР—

1. **Галякоў** Іван Цярэнцьевіч.

ЧЛЕНЫ ВЯРХОЎНАГА СУДА СССР:

2. **Алексееў** Георгій Аляксеевіч.
3. **Абдурахманаў** Усман.
4. **Алексанян** Алексан Агабекавіч.
5. **Баяркін** Міхаіл Аляксеевіч.
6. **Буленкоў** Аляксей Аляксеевіч.
7. **Буканаў** Васілій Васільевіч.
8. **Волк** Екацярына Архіпаўна.
9. **Гусеў** Андрэй Грыгор'евіч.
10. **Дзецістаў** Іван Васільевіч.
11. **Дзмітрыеў** Леанід Дзмітрыевіч.
12. **Жукаў** Дзмітрый Якаўлевіч.
13. **Заранаў** Іван Міхеевіч.
14. **Іеўлеў** Барыс Іванавіч.
15. **Камерон** Пётр Аляксеевіч.
16. **Караджаева** Нуры.
17. **Клімін** Фёдар Арсеньевіч.
18. **Корнеў** Іван Владзіміравіч.
19. **Каробко** Раіса Якаўлеўна.
20. **Кандыбін** Дзмітрый Якаўлевіч.
21. **Лодысеў** Сяргей Цярэнцьевіч.
22. **Малініна** Марыя Нікалаеўна.
23. **Матулевіч** Іван Осіпавіч.
24. **Наумаў** Нікалай Аляксандравіч.
25. **Нікітчэнка** Іона Цімафеевіч.
26. **Назарава** Анна Назараўна.
27. **Орлоўскі** Павел Ефімавіч.
28. **Огурцоў** Іван Канстанцінавіч.
29. **Орлоў** Аляксандр Майсеевіч.
30. **Панкратаў** Канстанцін Аляксандравіч.
31. **Рахімаў** Гаджы Мамедавіч.
32. **Раманава** Анна Аляксандраўна.
33. **Раманычэў** Міхаіл Грыгор'евіч.
34. **Сакіеў** Тюгульбай.
35. **Саладзілаў** Андрэй Пятровіч.
36. **Сауленка** Любоў Карнееўна.
37. **Смірнова** Еўлакія Васільеўна.
38. **Суслін** Андрэй Грыгор'евіч.
39. **Саланіцын** Нікалай Аляксеевіч.
40. **Ульрых** Васілій Васільевіч.
41. **Успенскі** Владзімір Аляксеевіч.
42. **Чагіраў** Баймухамед.
43. **Чэпцоў** Аляксандр Аляксандравіч.
44. **Чхэціані** Афанасій Леванавіч.
45. **Шарыфаў** Зарыф.

НАРОДНЫЯ ЗАСЯДАЦЕЛІ ВЯРХОЎНАГА СУДА СССР:

1. **Авезава** Мастура.
2. **Алдабергенаў** Тулеу.
3. **Барышэў** Сцяпан Нікіціч.
4. **Белан** Раман Васільевіч.
5. **Дзюканаў** Мірон Дзмітрыевіч.
6. **Ільін** Грыгорый Маркелавіч.
7. **Леонава** Ольга Фёдараўна.
8. **Малюшын** Нікалай Цімафеевіч.
9. **Мінаеў** Васілій Сцяпанавіч.
10. **Мірзаеў** Тішабай.
11. **Мір Касімаў** Мір Асадула Мір Алескер оглы.
12. **Малякоў** Васілій Фёдаравіч.
13. **Огнёў** Аляксандр Сцяпанавіч.
14. **Орлоў** Пётр Сямёнавіч.
15. **Сметанін** Нікалай Сцяпанавіч.
16. **Цатурян** Цатур Алекавіч.
17. **Цыклауры** Андрэй Васільевіч.
18. **Чулетаў** Мурад.
19. **Шамсутдзінаў** Галім Шамсутдзінавіч.
20. **Якуш** Пелагея Остапаўна.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква. Крэмль. 17 жніўня 1938 г.

ЗАКОН АБ ГРАМАДЗЯНСТВЕ Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік

Артыкул 1. На падставе арт. 21 Канстытуцыі (Асноўнага закона) Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік для грамадзян СССР устанаўліваецца адзінае саюзнае грамадзянства.

Кожны грамадзянін Саюзнай рэспублікі з'яўляецца грамадзянінам СССР.

Артыкул 2. Грамадзянамі СССР з'яўляюцца:

а) усе, што былі да 7 лістапада 1917 года падданымі былой Расійскай імперыі і не ўтраціўшыя совецкага грамадзянства;

б) асобы, якія набылі совецкае грамадзянства ва ўстаноўленым законам парадку.

Артыкул 3. Іншакраінцы, незалежна ад іх нацыянальнасці і расы, прымаюцца ў грамадзянства СССР па іх хадайніцтву Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР або Прэзідыумам Вярхоўнага Совета Саюзнай рэспублікі, у межах якой яны пражываюць.

Артыкул 4. Выхад з грамадзянства СССР дазваляецца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР.

Артыкул 5. Уступленне ў шлюб грамадзяніна або грамадзянкі СССР з асобай, не маючай грамадзянства СССР, не цягне змены грамадзянства.

Артыкул 6. Пры змене грамадзянства бацькоў, у выніку якога абодва становяцца грамадзянамі СССР або абодва выходзяць з грамадзянства СССР, змяняецца адпаведна грамадзянства іх дзяцей, не дасягнуўшых 14-гадовага ўзросту. Змена грамадзянства дзяцей ва ўзросце ад 14 да 18 год можа паследваць толькі з іх згоды.

У іншых выпадках змена грамадзянства дзяцей, не дасягнуўшых 18 год, можа паследваць толькі ў агульным парадку.

Артыкул 7. Пазбаўленне грамадзянства СССР можа мець месца:

а) па прыгавору суда—у выпадках, прадугледжаных законам;

б) у сілу асобага ў кожным выпадку Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

Артыкул 8. Асобы, пражываючыя на тэрыторыі СССР, не з'яўляючыяся ў сілу гэтага закона грамадзянамі СССР і не маючыя доказаў сваёй прыналежнасці да замежнага грамадзянства, лічацца асобамі без грамадзянства.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
19 жніўня 1938 г.

Другая Сесія Вярхоўнага Совета СССР 1-га склікання

Законы, прынятыя Вярхоўным Советам СССР

ЗАКОН АБ ПАРАДКУ РАТЫФІКАЦЫІ І ДЭНАНСАЦЫІ МІЖНАРОДНЫХ ДАГАВОРАЎ СССР

Артыкул 1. У адпаведнасці з пунктам «М» артыкула 49 Канстытуцыі (Асноўнага закона) Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік, ратыфікацыя міжнародных дагавораў утвараецца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР.

Артыкул 2. Ратыфікацыі падлягаюць заключаемыя Саюзам Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік мірныя дагаворы, дагаворы аб узаемнай абароне ад агрэсіі, дагаворы аб узаемным ненападзе.

Роўным чынам, ратыфікацыі падлягаюць міжнародныя дагаворы, пры заключэнні якіх стораны ўмовіліся аб наступнай ратыфікацыі.

Артыкул 3. Дэнансацыя ратыфікаваных міжнародных дагавораў утвараецца на падставе указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
20 жніўня 1938 г.

ЗАКОН АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ ПАДАТКУ НА КОНЕЙ АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРАК

У сувязі з тым, што па сведчанню калгаснікаў коні ў аднаасобных сялянскіх гаспадарках звычайна скарыстоўваюцца не для сельскагаспадарчых работ у сваёй гаспадарцы, а ў мэтах спекуляцыйнай нажывы па-за сваёй гаспадаркай, Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, ідучы насустрач пажаданням калгаснікаў, **пастанаўляе:**

1. Увесці асобы дзяржаўны падатак на коней аднаасобных гаспадарак.

2. Стаўкі дзяржаўнага падатку з аднаасобных гаспадарак, маючых коней, устанавіць па асобных рэспубліках, краях і абласцях у наступных размерах:

Рэспублікі, краі і вобласці	За аднаго каня	За кожнага наступнага каня звыш адной галавы
1. РСФСР (за выключэннем указаных ніжэй краёў, абласцей і АССР), Украінская ССР, Беларуская ССР	1-я група раёнаў 400 руб. 2-я група раёнаў 500 руб.	1-я група раёнаў 700 руб. 2-я група раёнаў 800 руб.
2. Азербайджанская, Грузінская, Армянская, Туркменская, Узбекская, Таджыкская, Казахская і Кіргізская ССР; Далёкаўсходні і Краснаярскі край; Іркуцкая і Чыцінская вобласці; Дагестанская, Бурат-Мангольская, Кабардзіна-Балкарская, Калмыцкая, Карэльская, Комі, Паўночна-Осецінская, Чэчэна-Інгушская і Якуцкая АССР.	1-я група раёнаў 275 руб. 2-я група раёнаў 350 руб.	1-я група раёнаў 450 руб. 2-я група раёнаў 550 руб.

3. Ускласці на краявыя і абласныя выканаўчыя камітэты Советаў Дэпутатаў працоўных, а ў Аўтаномных рэспубліках і Саюзных рэспубліках, не маючых абласнога дзялення, на Советы Народных Камісараў аднясенне тых або іншых раёнаў або акруг па стаўках падатку да 1-й і 2-й груп у залежнасці ад размера даходаў, атрымліваемых ад скарыстання каня.

4. Падатак на коней уплачваюць усе аднаасобныя гаспадаркі, маючыя к моманту апублікавання закона коней ва ўзросце ад трох год і вышэй. Продаж коней пасля апублікавання закона не аслабаняе ад уплаты падатку за бягучы год.

5. Устанавіць тэрмін уплаты падатку — 15 кастрычніка.

6. Гаспадаркі, уступіўшыя ў калгасы да 15 кастрычніка 1938 г. і здаўшыя ў калгасы сваіх коней, аслабаняюцца ад уплаты дзяржаўнага падатку на коней.

7. Паступленні ад падатку на коней аднаасобных гаспадарак накіроўваюцца: 25 проц. у бюджэты Саюзных рэспублік; 25 проц. у бюджэты краёў, абласцей і аўтаномных рэспублік і 50 проц. у раённыя бюджэты.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
21 жніўня 1938 г.

ЗАКОН АБ УСЕСАЮЗНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎЦЫ

Вярхоўны Совет СССР адзначае велізарнае значэнне арганізуемай па рашэнню ўрада Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў справе далейшага ўздыму соцыялістычнай сельскай гаспадаркі ў СССР.

Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка, якая заклікана дастойна адлюстраваць вялікія дасягненні соцыялістычнай сельскай гаспадаркі ў СССР, паказаць лепшыя ўзоры ўсіх галін сельскай гаспадаркі, прадэманстраваць ва ўсёй разнастайнасці магутнасць і багацце сельскай гаспадаркі рэспублік, краёў і абласцей Совецкага Саюза, — павінна даць магутны штуршок соцыялістычнаму спаборніцтву калгасаў і калгаснікаў і ўсіх работнікаў сельскай гаспадаркі для памнажэння дасягненняў сельскай гаспадаркі, будзе садзейнічаць падцягванню ўсёй масы калгасаў і соўгасаў да ўзроўню перадавых з тым, каб забяспечыць далейшы няўхільны ўздым сельскай гаспадаркі, рост багацця сельскагаспадарчых прадуктаў, заможнасці і культурнасці калгасных мас.

Вярхоўны Совет разам з тым адзначае нездавальняючае становішча падрыхтоўкі сельскагаспадарчай выстаўкі. Да гэтага часу Наркамземам і Наркамсоўгасаў СССР яшчэ не ўстаноўлены дыферэнцыяваныя паказальнікі для адбору ўдзельнікаў выстаўкі прымяняльна да разнастайных асаблівасцей сельскагаспадарчай вытворчасці ў розных па кліматычных, глебавых і іншых умовах раёнах СССР, не закончаны работы па будаўніцтву выстаўкі, а асобныя павільёны, пабудаваныя ўжо, яўна не адказваюць тым патрабаванням, якія пастаўлены перад Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкай.

У мэтах выпраўлення ўказаных сур'ёзных недахопаў у падрыхтоўцы да адкрыцця выстаўкі і ў мэтах яе найлепшай арганізацыі, а таксама ў інтарэсах шырокага разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва ў калгасах, соўгасах, машынна-трактарных станцыях і калгасных таварных фермах на права ўдзелу ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік **пастанаўляе:**

1. Прапанаваць Наркамзему і Наркамсоўгасаў СССР неадкладна выправіць указаныя памылкі і недахопы ў арганізацыі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

2. Перанесці адкрыццё Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі на 1939 год, назначыўшы адкрыццё яе на 1 жніўня 1939 года.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
21 жніўня 1938 г.

АБ ЗМЕНЕ І ДАПАЎНЕННІ АРТЫКУЛАЎ 22 І 23 КАНСТЫТУЦЫІ (АСНОЎНАГА ЗАКОНА) СССР

Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік **пастанаўляе:**

1. Зацвердзіць утварэнне ў саставе Расійскай Совецкай Федэратыўнай Соцыялістычнай Рэспублікі Мурманскай вобласці.

У адпаведнасці з гэтым ізлажыць артыкул 22 Канстытуцыі СССР наступным чынам:

«**Артыкул 22.** Расійская Совецкая Федэратыўная Соцыялістычная Рэспубліка складаецца з краёў:

Алтайскага, Далёкаўсходняга, Краснадарскага, Краснаярскага, Орджанікідзеўскага; абласцей: Архангельскай, Валагодскай, Варонежскай, Горкаўскай, Іванаўскай, Іркуцкай, Калінінскай, Кіраўскай, Куйбышаўскай, Курскай, Ленінградскай, Маскоўскай, Мурманскай, Новасібірскай, Омскай, Орэнбургскай, Орлоўскай, Растоўскай, Разанскай, Саратаўскай, Свердлоўскай, Смаленскай, Сталінградскай, Тамбоўскай, Тульскай, Чэлябінскай, Чыцінскай, Яраслаўскай; Аўтаномных совецкіх соцыялістычных рэспублік: Татарскай, Башкірскай, Дагестанскай, Бурат-Мангольскай, Кабардзіна-Балкарскай, Калмыцкай, Карэльскай, Комі, Крымскай, Марыйскай, Мардоўскай, Немцаў Паволжа, Паўночна-Осецінскай, Удмурцкай, Чэчэна-Інгушскай, Чувашскай, Якуцкай; аўтаномных абласцей: Адыгейскай, Яўрэйскай, Карачаеўскай, Ойроцкай, Хакаскай, Чэркескай».

2. Зацвердзіць утварэнне ў саставе Украінскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі абласцей: Сталінскай і Варашылаўградскай.

У адпаведнасці з гэтым ізлажыць артыкул 23 Канстытуцыі СССР наступным чынам:

«**Артыкул 23.** Украінская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка складаецца з абласцей: «Вінніцкай, Варашылаўградскай, Днепрапетроўскай, Жытомірскай, Каменец-Падольскай, Кіеўскай, Нікалаеўскай, Одэскай, Палтаўскай, Сталінскай, Харкаўскай, Чэрнігаўскай і Малдаўскай Аўтаномнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі».

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
21 жніўня 1938 г.

Аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб назначэнні Народнымі Камісарамі СССР Л. М. КАГАНОВІЧА, Н. І. ЕЖОВА, С. Е. СКРЫННІКАВА, В. К. ЛЬВОВА, І. Г. КАБАНАВА

Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік пастанаўляе зацвердзіць Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб назначэнні:

Народным Камісарам Шляхоў Зносін па сумяшчэнню з работай Народнага Камісара Цяжкай Прамысловасці — Лазара Майсеевіча **Кагановіча**.

Народным Камісарам Воднага Транспарта па сумяшчэнню з работай Народнага Камісара Унутраных Спраў — Нікалая Іванавіча **Ежова**.

Народным Камісарам Загатовак — Сямёна Емельянавіча **Скрыннікава**.

Народным Камісарам Машынабудаўніцтва — Віктара Канстанцінавіча **Львова**.

Народным Камісарам Харчовай Прамысловасці — Івана Грыгор'евіча **Кабанава**.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
21 жніўня 1938 г.

Аб зацвярджэнні Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб назначэнні Лазара Майсеевіча КАГАНОВІЧА Намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў СССР

Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік пастанаўляе зацвердзіць Намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў СССР — Лазара Майсеевіча **Кагановіча** з пакіданнем яго Народным Камісарам Цяжкай Прамысловасці і Народным Камісарам Шляхоў Зносін.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
21 жніўня 1938 г.

У САЮЗЕ СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Нядаўна адбыўся сход актыва пісьменнікаў БССР. На сходзе прысутнічалі: прадстаўнік Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР В. М. Бахмецьеў, загадчык аддзелам друку ЦК КП(б)Б тав. Малін, прадстаўнікі студыі Белдзяржкіно і пачынаючыя пісьменнікі.

Выступаючыя на сходзе таварышы завастрылі ўвагу на пытаннях неабходнасці ўмацавання Праўлення ССП; ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, нанесенага ворагамі народа; умацавання сувязі пісьменнікаў з масамі; уздыму якасці творчасці пісьменнікаў і барацьбы за сучасную тэматыку; выхавання маладых кадраў пісьменнікаў, а таксама ўдзелу пісьменнікаў у кінамастацтве.

Ва ўступнай прамове вык. аб. старшыні Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР тав. Лынькоў расказаў пра становішча ў Саюзе, адзначыў рост радоў пісьменнікаў за лік маладых пачынаючых здольных празаікаў і паэтаў. У рабоце драматургаў, як адзначыў тав. Лынькоў, ёсць дасягненні: тт. Крапіва, К. Чорны, Клімковіч, Я. Колас напісалі п'есу (сярод якіх п'есы «У пушчах Палесся» Я. Коласа і «Партызаны» К. Крапівы), якія совецкая грамадскасць бачыць на сцэнах тэатраў БССР; т. Броўка напісаў лібрэта оперы «Міхась Падгорны»; тт. Шапавалаў, Клімковіч, К. Чорны таксама пішуць оперныя лібрэта.

Есць значны рост творчасці празаікаў тт. Бядулі, Чорнага, Пасляловіча, Самуйлёнкі і паэтаў тт. Броўкі, Глебкі, Куляшова, Агняцвет, Калачынскага. Адзначан рост творчасці яўрэйскіх пісьменнікаў тт. Дзехціяра і С. Каган.

Гаворачы пра недахопы работы саюза, тав. Лынькоў падкрэсліў, што да гэтага часу яшчэ няма карэннай перабудовы работы. Секцыі як належыць не працуюць. Рукапіс пісьменніка не ставіцца ў цэнтры ўвагі саюза. Сувязь пісьменнікаў з масамі ўсё яшчэ слабая. Няма рашучага павароту ў творчасці пісьменнікаў да сучаснай тэматыкі. Нічога не зроблена па напісанню сцэнарыяў для кіно.

Недахопам з'яўляецца і тое, што творчасць пісьменнікаў абмяркоўваецца ў вузкім коле, на секцыях і пасяджэннях Праўлення саюза, часам пры няпоўным складзе членаў. За апошнія годы мала хто з пісьменнікаў і паэтаў Беларусі выступаў перад рабочымі масамі з разгорнутым паказам сваёй творчасці, калі не лічыць выступленняў пісьменнікаў з чыткай сваіх вершаў у часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР і БССР.

Большэвіцкая пільнасць у арганізацыі яшчэ не на вышыні. Толькі прытупленнем большэвіцкай пільнасці тлумачыцца той факт, што пасля разгрому ў БССР асноўных гнёздаў ворагаў народа ў Саюзе пісьменнікаў нацыянал-фашысцкія паслелышы цэлы год яшчэ працягвалі сваю работу і былі выкрыты толькі ў апошні час.

Тав. К. Чорны ў сваім выступленні паставіў пытанне аб неабходнасці павышэння ацэначнага крытэрыя мастацкай творчасці пісьменнікаў. Нізкі ацэначны крытэрый, — сказаў тав. Чорны, — даваў і дае магчымасць пралазіць у рады пісьменнікаў людзям, нічога агульнага не маючым з літаратурай, а часта і ворагам народа, якія сваю халтурную, контррэволюцыйную, замаскаваную творчасць імкнуліся выдаваць за сапраўдную літаратуру.

Выступаўшыя тт. Броўка, Глебка, Клімковіч, Мальцінскі, Модэль і інш., гаворачы аб дасягненнях літаратуры і мастацтва БССР, рэзка крытыкавалі работу Праўлення ССПБ. Яны гаварылі аб адсутнасці ўвагі з боку Праўлення да творчых пытанняў пісьменніка, аб недастатковай сувязі партарганізацыі з пісьменніцкай масай. Да гэтага часу няма высокакваліфікаваных перакладчыкаў. Адсутнасць работы з маладымі аўтарамі прывяла да таго, што мы мала ведаем маладых пісьменнікаў, сярод якіх ёсць здольная моладзь. Прамоўцы ўказвалі, што мы вельмі многа на нашых сходах гаворым аб недахопах і мала чаго робім для іх знішчэння.

У сваім выступленні тав. Кучар, крытыкуючы работу Праўлення ССПБ, сам быў зусім несамакрытычным. Ён нічога не сказаў аб недахопах у галіне крытыкі, абмежаваўся няемелым прызнаннем: «сам пісаў мала». Таварыш Кучар, як крытык, не дапамагае падняццю якасці творчасці і росту новых, маладых кадраў.

Выступаючы на сходзе В. М. Бахмецьеў адзначыў рост беларускай літаратуры і яе кадраў. Разам з гэтым ён адзначыў, што сярод пісьменнікаў БССР зусім недастатковае партыйнае ядро, у той час, калі сярод пісьменнікаў ёсць добрыя непартыйныя большэвікі. Гэта гаворыць аб слабай рабоце партыйнай і комсамольскай арганізацыі. Ён даў рад канкрэтных указанняў для паляпшэння работы Праўлення ССПБ і яго секцый. Тав. Бахмецьеў указаў на вялікую дапамогу партыі і ўрада работнікам літаратурнага і мастацкага фронта ў іх творчай рабоце.

ВЯЛІКІ РУСКІ АКТОР

23 жніўня мінула 75 год з дня смерці геніяльнага актора рускай сцэны і найвялікшага рэаліста, — аснавальніка слаўных «шчэпкінскіх» традыцый, родапачынальніка выдатнай плеяды майстроў рускага тэатра — Міхаіла Сямёнавіча Шчэпкіна.

Міхаіл Сямёнавіч Шчэпкін нарадзіўся 17 лістапада 1788 года ў Курскай губерні ў сям'і прыгоннага селяніна графа Волькенштэйна. Першапачатковую адукацыю атрымаў у ключніка і прыходскага папа. Бацька Мішы Шчэпкіна, разумеючы выгаду вучобы, парашае аддаць яго да свяшчэнніка ў Белгорад.

Па дарозе Міхаіл з бацькам праязджае галоўную рэзідэнцыю графа Волькенштэйна,



дзе ідзе хатні спектакль—опера «Новае сямейства». Спектакль зрабіў велізарнае ўражанне на сямігадовага хлопчыка. «У гэты вечар вырашыўся ўвесь будучы лёс мой»,—гаворыць Шчэпкін.

Далей адданы ў Суджынскае павятовае вучылішча, ён прымае ўдзел у школьных спектаклях. Скончыўшы тры класы, вымушаны быў кінуць вучылішча з-за свайго прыгоннага становішча.

Пераехаўшы ў Курск, Шчэпкін займае сярэдняе становішча паміж сакратаром і лакеем графа. Увесь вольны час чытае і праводзіць у тэатры.

Выпадак дапамог Шчэпкіну ажыццявіць яго заветную мару—трапіць на сцэну. У бенефіс актрысы П. Г. Лыкавай актор, які іграў галоўную ролю, прайграў у тракціры сваю вопратку і бенефіс быў пад пагрозай зрыву. Даведаўшыся аб гэтым, Шчэпкін, добра ведаючы ролю пісьмаводы Андрэя ў п'есе «Зоя», якую не раз суфліраваў прапанаваў свае паслугі. Праслухаўшы яго чытанне, Лыкава параіла не гаварыць так хутка і не махаць рукамі і прыняла прапанову. Дэбют прайшоў вельмі ўдала.

З заняпадам дваранства прыгонныя тэатры пачынаюць набываць камерцыйны характар. Некаторыя памешчыкі прадаюць сваіх актораў. Так, напрыклад, была куплена трупа Сталыпіна, стаўшая касцяком Вялікага тэатра. Некаторыя пачынаюць паказваць сваіх актораў за плату, а некаторыя адпускаюць сваіх актораў на аброк. Становішча актораў, як прыгонных, так і вольных, было бяспраўным і нязносным. Гаспадары тэатраў збівалі актораў, саджалі пад арышт, месяцамі не давалі пенсіі, зусім не лічачы іх за людзей. Яркае апісанне бяспраўнага становішча актораў дае сучаснік Шчэпкіна актор Салоўскі: «Правінцыяльны актор не мае нічога трывала забяспечанага, ні славы, якая для яго ў поўным сэнсе—дым, ні маёмасці (аб багацці ён і марыць не смее), ні нават кавалка хлеба. Слава яго не пераходзіць за межы таго горада, дзе ён іграе...»

«Акторы ў большасці сваёй людзі бязграматныя, ролі вывучалі са слыху, добрай ігрой лічылася, як сведчыць сам Шчэпкін, хадульная дэкламацыя, словы выгаварваліся як можна больш голасна, кожнае слова суправаджалася жэстамі... Словы: любоў, страсць, здрада выкрыкваліся так голасна, як толькі хапала сілы ў чалавека». Але мімікі адсутнічала, твар заставаўся каменным. Моцныя месцы ролі гаварыліся не да партнёра, а з авансцэны да публікі, і калі пасля ўсяго гэтага трэба было адыходзіць, то абавязкова неабходна было падымаць правую руку і так аддаляцца за куліса.

Пераломам да рэалізма адбыўся ў 1810 годзе пасля сустрэчы з аматарам князем Мешчэрскім, які здзівіў Міхаіла Сямёнавіча прастатой і натуральнасцю сваёй ігры. У гэты час Шчэпкін лічыўся ўжо лепшым акторам трупы Барсавых і атрымліваў найвышэйшы аклад—350 рублёў у месяц.

У 1816 годзе Шчэпкін пераходзіць у трупу Штэйна і Каліноўскага ў Харкаў. І з Харкава, па прапанове генерал-губернатара князя Рэпніна, з трупай пераехаў у Палтаву.

У 1818 годзе пачынаецца справа Шчэпкіна аб вызваленні яго ад прыгоннай залежнасці. Будучы ўжо вядомым акторам, Шчэпкін заставаўся прыгонным князя Волькенштэйна. Гэта маральна вельмі прыгнятала Шчэпкіна. Па падпіснаму лісту было сабрана 1000 рублёў асігнацыямі «Ва ўзнагароду актора Шчэпкіна, на аснове яго лёсу», але гэтай сумы нехапіла і, выкупіўшы Шчэпкіна, князь Рэпнін не зрабіў яго вольным. Поўную свабоду Міхаіл Сямёнавіч атрымаў толькі ў 1821 годзе, выплаціўшы па частках патрабуемую князем суму.

Шчэпкін прыйшоў у Малы тэатр зусім оклаўшымся рэалістычным акторам і хутка заняў вядучае становішча ў тэатры. Міхаіл Сямёнавіч, яшчэ будучы ў правінцыі, многа часу аддае самаадукацыі, што дае яму магчымасць уступіць у кола такіх людзей, як Белінскі, Герцэн, Аксакаў; яго звязвае асабістая дружба з Пушкіным, Грыбаедавым, Тургеневым, Лермантавым і Гогалем. Апошняга ён асабліва любіў.

Дружба з такімі людзьмі гаворыць аб тым высокім разумовым і мастацкім узроўні, на якім стаяў Шчэпкін.

Першыя годы работы ў Малым тэатры Шчэпкін іграе пераважна ў перакладных вадэвілях. Натуральна, што гэты мала мастацкі рэпертуар не мог задаволіць таленавітага артыста. Шчэпкін сумуе па ролях, патрабуючых работы, сумуе па Мальеру.

У спісак сыграных ролей уваходзіць: суфле ў вадэвілі «Сакратар і повар», «Стары і малады», «Дзядзька на пракат», «Хлапатчук», «Нявеста трох жаніхоў» і т. д. Быў у рэпертуары Шчэпкіна і Мальер — «Школа мужоў», «Скупы», Гарпагона—«Мізантроп», «Мешчанін дваранінам» — Журдэн, і ў «Школе жонак» іграў Арнольда. Трэба, аднак, памятаць, што Мальер іграўся ў нас перарobленым на рускі лад: напрыклад, Журдэн з «Мешчаніна дваранінам» ператварыўся ў Дурмана, Орэнт з «Тарцюфа» ў Знатава і т. д.

Гістарычная заслуга Шчэпкіна ў тым, што ён першы аформіў школу рэалістычнай ігры. Міхаіл Сямёнавіч патрабуе вывучэння жыцця і праўдзівага перанясення вывучанага на сцэну. Погляды Шчэпкіна відаць з яго пісьма да актора Шумскага: «Карыстайся выпадкам цяжкага... не адвяргай заўваг, а ўдумвайся ў іх глыбей і для праверкі сябе і перад заўсёды мей на ўвазе натуру; улазь так сказаць, у скуру дзеючай асобы, вывучай добра яе грамадскі быт, яе адукацыю, яе асаблівыя ідэі... Калі ўсё будзе вывучана, ты абавязкова сыграеш верна...

Сачы несупынна за сабой, няхай публіка табой задаволеная, але сам да сябе будзь больш строгім... Імкніся быць у грамадзе, колькі дазваляе, вывучай чалавека ў масе, не пакідай ні аднаго анекдота без увагі... Таму ўглядайся ва ўсе пласты людзей, без усякай прадузятасці да таго ці іншага... Не пагарджай аддзелкай сцэнічных становішчаў і розных дробязей, заўважаных у жыцці, але памятай, каб гэта было дапаможным сродкам, а не галоўным прадметам...»

Шчэпкін не толькі прапаведвае сцэнічную дысцыпліну, але ўздзейвае і асабістым прыкладам. Колькі-б разоў ён ні іграў ролю, ён усё-ж яе заўсёды паўтарае, шукае новыя фарбы. Не было такога выпадку, каб Міхаіл Сямёнавіч спазніўся на рэпетыцыю ці прыйшоў не падрыхтаваным (вучыў ён ролі напамяць). Вобраз Фамусава не адразу быў створаны такім, якім ён увайшоў у гісторыю — патрабавалася ўпартая і доўгая праца Шчэпкіна для аддзелкі гэтае ролі. Геніяльнасць Шчэпкіна не перашкаджала яму быць вельмі працавітым. Белінскі лічыць Шчэпкіна нібы сінтэзам натхнёнасці Мачалава і тэхнікі Каратыгіна.

Выдатны актор, з цвёрда устанавіўшыміся рэалістычнымі пазіцыямі, не мог задаволіцца тым шаблонным, перакладным і тагочасным рускім рэпертуарам, які панаваў на сцэне Малога тэатра.

Але вось з'яўляецца «Рэвізор» Гогаля. Шчэпкін стварае выдатны вобраз гараднічага, які ён безупынна ўдасканальвае. У «Рэвізоры» дваране бачылі «патрасенне асноў» і прыём быў вельмі сухі. Шчэпкін расказвае, як адзін знаёмы дасціпна растлумачыў прычыну гэтай стрыманасці. «Даруйце, — гаворыць ён, — як можна было лепш яе прыняць, калі палова публікі біручая, а палова даючая*).

Погляды Гогаля і Шчэпкіна на тэатр аднолькавыя і гэта асабліва наблізіла іх адзін да аднаго. Шчэпкін увасабляе на сцэне ідэі свайго друга. Аднак, пазней, калі Гогаль, пад уплывам нападкаў на яго і містычных настрояў, перарабляе «Рэвізор» і прапануе разглядаць «Рэвізор» як сімвалы, Шчэпкін рэзка выступае супроць гэтай трактоўкі. «Не давайце мне ніякіх намёкаў, што гэта, моў, не чыноўнікі, а нашыя страсці. Не, я не хачу гэтай перарабкі: гэта людзі, сапраўдныя, жывыя людзі, паміж якімі я вырас і амаль састарэў... Не, я вам іх не дам, не дам, пакуль існую. Пасля мяне перарабіце хоць у казлоў... а я не ўступлю вам Дзержымарды, таму што ён мне дарагі».

Пасля гараднічага Шчэпкін іграе ў «Жаніцьбе» Падкалёсіна і Качкарова, Уцешыцельнага ў «Іграках» і Бурдзюкова ў «Іграках».

У 50-гадах паяўляецца новы драматург — Астроўскі. Шчэпкін іграе Любіма Тарцова і Бальшова, але не разумее Астроўскага і не прымае яго.

Сілы паступова пакідаюць старога актора. Ен памёр у Ялце 11 жніўня 1863 года, пасля таго, як цэлы вечар чытаў у палацы графа Варанцова ўрыўкі з «Мёртвых душ» Гогаля.

Імя М. С. Шчэпкіна ўвайшло ў гісторыю рускага тэатра як важнейшы этап у развіцці рэалістычнага мастацтва. Шчэпкін—выдатны майстар стварэння праўды на сцэне — «першы ў тэатры нетэатральны актор», як назваў яго Герцэн; геніяльны настаўнік і натхніцель плеяды вялікіх актораў, упрыгожваўшых доўгія годы Маскоўскі Малы тэатр. Традыцыі Шчэпкіна—гэта традыцыі жыццёвага, праўдзівага, соцыяльна-насычанага мастацтва, гэта традыцыі бязмежнай чэснасці і адданасці мастака свайму мастацтву. І не дарма геніяльны Станіслаўскі гаварыў, што Маскоўскі мастацкі тэатр заснаваны на заветах Шчэпкіна.

Заветы Шчэпкіна жывыя і дзейсныя і для нашага совецкага тэатра.

Г. ШУСТЭР.

*) біручая і даючая хабар.

Нам. адказнага рэдактара
А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязда» Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку.
[illegible] газеты: Менск, Савецкая, 76. Дом пісьменніка Тэлефон 25-394.
Ул. Галоўлітбела № К—5586.